№ 20 (474) 2 чэрвеня 2006

www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

ISSN 1819-1614

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Фонд выданьня газэты «Наша Ніва». Выходзіць штотыдня, у пятніцы



## Папа Бэнэдыкт

маліўся зь беларускім палітвязьнем. Старонка 2.



## Самая масавая галадоўка

22 юнакі далучыліся да акцыі пратэсту. Яны патрабуюць спыненьня палітычных рэпрэсій. Старонка 3.

**Каб рэгулярна атрымліваць «Нашу Ніву»,** проста паведаміце ў Рэдакцыю свой адрас. Адначасова Рэдакцыя зьвяртаецца з просьбай ахвяраваць на выданьне. Дэталі — **старонка 11.**

## Шантажом на шантаж

«Газпром» палохае газам за 200 даляраў, беларуская мытня нагадала Расеі пра калінінградзкі транзыт. Старонка 8.




Цуд у самым усходнім манастыры Беларусі. Рэпартаж Сяргея Харэўскага з Амсьціслава. **Старонка 13.**



## Цуды ў Пустынках



# у нумары


## воля і пятля

Крайнія формы пратэсту ........ 3

Сяргей Ляшкевіч віны не прызнаў ........ 4

Хроніка рэпрэсій і супраціву за 23—29 траўня ........ 6

## люстра дзён

Шантажом на шантаж ........ 8

Мілінкевіч уганараваны прэміяй Фундацыі «Кран—Мантана» ........ 8

Людзі Х: рэпартаж са зьезду АГП ........ 9

Дзяніс Дзянісаў: Пакуль не магу паведаміць падрабязнасьцяў ........ 10

Атрымаць крэдыт і нічога ня страціць ........ 23

## вандроўка

Цуды ў Пустынках ........ 13

## камэнтары і меркаваньні

Аляксандар Класкоўскі. Усе ў пастцы ........ 16

Віталь Тарас. Нашчадкі Лубянкі ........ 20

## культура

Пушкін incognitus ........ 19

«Гудбай, бацька» ........ 25

Хэ–хэ–хэ ........ 26

Беларусь у «свабадзянскіх» апавяданьнях ........ 26

Гедройц у Менску ........ 28

Трэцяе пакаленьне Х ........ 29

Некаторыя любяць глыбакадумней ........ 29

## левым вокам

Лёлік Ушкін. Кнопка Мілера ........ 25

## калі б...

Малюнкі Лёліка Ушкіна ........ 47


**Кіроўцу, што развозіў вызваленых з Акрэсьціна й Жодзіна, траба дапамога**

Віктар Савіцкі, кіроўца, што на ўласным транспарце развозіў людзей, якіх выпускалі з Акрэсьціна й Жодзіна ў сакавіку–красавіку, 28 красавіка трапіў у цяжкую аварыю. Ён дагэтуль знаходзіцца ў рэанімацыі. Дактары прагназуюць доўгі пэрыяд лекаваньня і рэабілітацыі. Курс рэабілітацыі дарагі, да таго ж, у чалавека сям'я, малыя дзеці.

Зьвяртаемся з просьбай да ўсіх, каму ён дапамагаў, да ўсіх людзей добрай волі з просьбай пра ахвяраваньні.

Р/р 3819382101009, 275 аддзяленьне, філіял 500 АСБ «Беларусбанк», код 601

УНН 100603596. Раковіч Вользе Ўладзімераўне. З пазнакай «ахвяраваньне».

**Просім усіх, хто мае магчымасьць, перадрукаваць гэтае паведамленьне.**

**АД РЭДАКЦЫІ**

# Касьцёл далучыўся да патрабаваньня грамадзянскіх свабодаў

2300 беларусаў удзельнічалі ў сустрэчы з папам у Варшаве — гэта зьвесткі польскае памежнае службы. Сапраўды, на пляцы Пілсудзкага скрозь былі бел-чырвона-белыя сьцягі. Як відна, беларусы моцна прывязаліся да сваіх нацыянальных колераў. Беларуская мова была адной з трох, якія ўжываліся на варшаўскім набажэнстве. Акрамя яе, малітвы гучалі па-польску і па-ангельску. Выкарыстаньне беларускай мовы Касьцёлам стае добраю традыцыяю. Гэта важная азнака яе адраджэньня.

Але ня гэта прыцягнула найбольшую ўвагу падчас першага вялікага візыту папы.

Малітву на беларускай мове прачытаў беларускі студэнт з Варшавы Зьміцер Гурневіч — былы палітвязень турмы на Акрэсьціна. З папскага аўтара па-беларуску прагучаў заклік маліцца за свабоду і чалавечую годнасьць: *«Памятаючы пра тое, што людзі розных расаў, нацыянальнасьцяў і народаў зьяўляюцца адной сям'ёй, молімся за свабоду і пашану годнасьці кожнага чалавека, асабліва ў тых краінах, дзе парушаюцца і абмяжоўваюцца грамадзянскія правы — каб ніхто не цярпеў ад прымусу, дыскрымінацыі і прычыненай крыўды».*

Выбар Зьмітра Гурневіча быў зроблены калі не самімі беларускімі біскупамі, дык зь іхнага ведама, а таму ня можа быць выпадковым.

Дагэтуль улады з Касьцёлам лічыліся і на канфлікт не ішлі, калі ня браць пад увагу шавіністычных штучак кшталту падручніка гісторыі Трашчанка. А Касьцёл быў асьцярожны і ўнікаў тэмы правоў чалавека. Цяпер з боку Касьцёлу прагучала выразнае пасланьне салідарнасьці і пратэсту. Касьцёл зрабіў яго ў стрыманай і непалітызаванай форме. Пасьля выбараў, а ня перад імі. Пасьля Плошчы, дзе некаторыя ксяндзы вырашылі заставацца з сваімі вернікамі.

У сілу гістарычных абставінаў, беларускі Касьцёл ня можа быць па-за ўплывам польскага ўспрыманьня сытуацыі ў Беларусі. Але дарма сьпісваць настроі ў ім толькі на замежны ўплыў. Гэта таксама адбітак прыхільнасьцяў малодшага пакаленьня беларускіх ксяндзоў і сьвецкага актыву, з пакаленьня незалежнасьці. Касьцёл чуйна прыслухоўваецца да сьвету. І лічыць сябе досыць кансалідаваным, каб не баяцца рэакцыі ўладаў кшталту той, якая напаткала Саюз палякаў ці меншыя пратэстанцкія цэрквы.

Усё шырэйшыя слаі патрабуюць дэмакратычных рэформаў і грамадзянскіх свабодаў. На сустрэчы з Бэнэдыктам прагучала недвухсэнсоўнае пасланьне Касьцёлу, і ўладам Беларусі варта над ім задумацца.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# Самая масавая галадоўка

22 юнакі далучыліся да галадоўкі маладафронтаўцаў. Яны патрабуюць спыненьня палітычных рэпрэсій.

Галадоўкі вяртаюцца ў палітычнае жыцьцё Беларусі. 29 траўня бестэрміновую палітычную галадоўку распачалі моладзевыя актывісты з Салігорску Максім Сяменчык, Мікола Пацкевіч, Яўген Мядзьведзеў і непаўнагадовыя браты Іван ды Ільля Шылы (ім 15 і 13 гадоў, адпаведна). 30 траўня да іх далучыўся салігорскі актывіст Партыі БНФ Павал Батуеў і Крысьціна Самойлава. Шылы, Батуеў, Сяменчык удзельнічалі ў намётавым гарадку ў Менску. Сяменчыка пасьля 10-суткавай адседкі ў жодзінскай турме выгналі з ПТВ №72 «за прагулы».

Галадоўнікі патрабуюць вызваліць усіх палітвязьняў і спыніць крымінальны перасьлед моладзевых актывістаў: за першае паўгодзьдзе крымінальныя справы за «ўдзел у незарэгістраваных арганізацыях» заведзеныя на актывістаў «Маладога фронту» і «Партнэрства». Дадатковае патрабаваньне салігорцаў — аднавіць у ПТВ М.Сяменчыка. Заява актывістаў перададзеная ў салігорскую пракуратуру. Менскія актывісты 31 траўня занесьлі сваю заяву ў Генэральную пракуратуру: яны таксама патрабуюць спыніць крымінальны перасьлед лідэраў «Маладога фронту» і вызваліць усіх палітвязьняў.

Салігорск стаўся іскаркай, ад якой успыхнула ўся краіна. 30—31 траўня да галадоўнікаў далучыліся хлопцы і дзяўчаты з Горадні (Яўген Скрабутан, Зьміцер Цесьлянок, Яўгенія Шасьцерыкова, Андрусь Фамін і дзесяцікласьніца Вольга Смалянчук) і Менску (Зьміцер Хведарук, Настасься Палажанка, Аляксей Янушэўскі, Антаніна Вежнявец, Павал Давідовіч, Аляксандра Янечка, Уладзімер Дубовік, Таццяна Анікеенка, Алена Ігнацьева). 31 траўня да галадоўкі далучыўся Ігар Шчакарэвіч у Кіеве — на момант напісаньня артыкулу агулам 22 чалавекі.

Я.Скрабутан выказаў жаданьне пераехаць у горад шахтароў: «Астатнія гарадзенцы наўрад ці здолеюць: школьнікаў не адпусьцяць бацькі, бо хочуць назіраць за імі ў такі адказны час, а студэнтам цяпер трэба здаваць сэсію». П.Батуеў кажа, што да галадоўнікаў абяцалі таксама далучыцца сябры АГП.

За выняткам салігорскіх, усе астатнія галадоўнікі пакуль трымаюцца паасобку. Барыс Гарэцкі, адзін зь фігурантаў крымінальнай справы «Маладога фронту», тлумачыць гэта тым, што многія ўдзельнікі акцыі навучаюцца й мусяць акурат гэтымі днямі здаваць іспыты на

Працяг на старонцы 7.

### Прысуд Аўтуховічу 1 чэрвеня

**Ваўкавыскі прадпрымальнік Мікалай Аўтуховіч, які пасьля 40 дзён звычайнай галадоўкі распачаў 23 траўня «сухую», чакае выраку. Падчас удзелу ў судовым працэсе 29 траўня зь ім дзяжурыў доктар. Прысуд мае быць абвешчаны 1 чэрвеня.**

Беларускі актывіст з малой радзімы Мілінкевіча асуджаны на 5 месяцаў за падрыхтоўку рэвалюцыі, але можа быць выпушчаны ўмоўна–датэрмінова проста цяпер.

# Сяргей Ляшкевіч віны не прызнаў

Актывіст нацыянальнага руху з Шчучына Сяргей Ляшкевіч асуджаны паводле ч.3 арт.293 Крымінальнага кодэксу РБ («Навучаньне альбо іншая падрыхтоўка асобаў да ўдзелу ў масавых беспарадках, а таксама фінансаваньне альбо іншае матэрыяльнае забесьпячэньне такіх дзеяньняў»). Пракурор патрабаваў для былога сябры ініцыятыўнай групы Мілінкевіча 6 месяцаў зьняволеньня. Судзьдзя прызнаў віну даказанай і даў пяць.

Суд над Сяргеем Ляшкевічам быў адкрыты, і першае паседжаньне 25 траўня адбывалася ў прысутнасьці вялікай колькасьці паплечнікаў і сяброў Сяргея. Падтрымаць свайго земляка прыехаў і Аляксандар Мілінкевіч, які назваў працэс замоўленым і палітычным.

Абвінавачаньне грунтавалася на сьведчаньнях неаднаразова асуджанага грамадзяніна Аляксандра Бурдзея. Гэта яго нібыта вэрбаваў Ляшкевіч. У часе паседжаньня дэманстравалі фільм Юр’я Хашчавацкага «Звычайны прэзыдэнт» і зборнік відэакліпаў «Незвычайны канцэрт», з дапамогай якіх Ляшкевіч «навучаў тэрарызму» Бурдзея і іншых фігурантаў справы.

Сьведка Валер Шкурко нібыта прысутнічаў пры размове, у часе якой Бурдзея схілялі да ўдзелу ў масавых акцыях.

Трэці сьведка, нехта Навагран, на суд не зьявіўся, матывуючы гэта страхам фізычнай расправы. Анкетныя зьвесткі Наваграна былі зьмененыя ў мэтах ягонай бясьпекі. Яго сьведчаньні, зробленыя падчас сьледчых мерапрыемстваў, зачыталі ў судзе. Зь іх вынікае, што Сяргей Ляшкевіч і яго паплечнікі вялі антыдзяржаўную дзейнасьць і яшчэ ў лістападзе мінулага году схілялі яго да ўдзелу ў масавых акцыях.

Аргумэнты, прапанаваныя адвакатамі Сяргея Ляшкевіча, суд не ўлічыў.

«Сяргей Ляшкевіч трымаецца добра, нават па-філязофску», — заўважыў ягоны адвакат Андрэй Шчапяткоў. Віны не прызнаў і ў заключным слове папрасіў суд вынесьці справядлівае рашэньне.

Паводле словаў адваката, згодна з заканадаўствам Сяргей мае права на ўмоўна-датэрміновае вызваленьне па адбыцьці паловы тэрміну зьняволеньня: «Усё залежыць ад яго самога: ці захоча ён абскарджваць рашэньне суду, ці не. Палову ж тэрміну ён ужо адбыў і мае шанцы быць вызваленым ужо цяпер».

**Сямён Печанко**


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Аляксандар Мілінкевіч з маці Сяргея Ляшкевіча.**

**Галоўны сьведка абвінавачаньня — тройчы судзімы Аляксандар Бурдзей.**

**Сяргея Ляшкевіча выводзяць з залі суду (на фота справа).**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

## СТАСЬ ПАЧОБУТ

ваша ўлада — наша каменьне
вашы грошы — наша сумленьне
ваша здрада — наша любоў
ваша шчасьце — наша кроў

ваш тэлевізар — нашы улёткі

вашы турмы — наша воля
вашы кулі — наша доля
ваш презыдэнт — наш народ
і вашы сэксоты — у наш карагод

ваш тэлевізар — нашы улёткі

вашы прагнозы — наша надзея
вашы занозы — у нашым целе
ваш сон — нашы Курапаты
і вашы лакеі шукаюць лапаты

*© deviation*

# Народны пісьменьнік Іван Навуменка: Чаргінец мяне з кімсьці блытае

Народны пісьменьнік Беларусі Іван Навуменка заўжды прынцыпова трымаўся ўбаку ад палітыкі. Аднак ня вытрымаў і ён. Апошняй кропляй сталі хамскія выказваньні М.Чаргінца на адрас народных пісьменьнікаў Беларусі. І.Навуменка адказаў адкрытым лістом Мікалаю Чаргінцу ў «Народнай волі». Ліст карацененькі, але ёмкі. Вось ён:

«У апошні час у некаторых пэрыядычных выданьнях М.Чаргінец, тлумачачы маю адсутнасьць у створаным ім аб'яднаньні літаратараў, публічна заяўляе, што «Іван Навуменка знаходзіцца амаль у коме». Да шматлікіх талентаў М.Чаргінца трэба, мабыць, дадаць яшчэ адзін — дыягностыка на адлегласьці. Інфармую яго: я ня ў коме. Ён мяне з кімсьці блытае.

Народны пісьменьнік Беларусі Іван Навуменка».

М.Чаргінец належыць да блізкага кола А.Лукашэнкі, ён сэнатар і ў былым — кіраўнік ініцыятыўнай групы па вылучэньні А.Лукашэнкі ў прэзыдэнты. Цяпер ён узначаліў лукашэнкаўскі Саюз пісьменьнікаў Беларусі, створаны ў піку незалежнаму Саюзу беларускіх пісьменьнікаў.

**Мікола Бугай**

## Зьезд Асацыяцыі журналістаў

У пятніцу адбудзецца чарговы зьезд Беларускай асацыяцыі журналістаў. З дакладам на форуме выступіць яе старшыня Жанна Літвіна. Чакаецца, што ў асацыяцыі адбудуцца кадравыя зьмены на ўзроўні намесьнікаў старшыні.

**МБ**

## ХРОНІКА РЭПРЭСІЙ І СУПРАЦІВУ 23 — 29 ТРАЎНЯ

### 23 траўня: допыты ў Воршы

Пракуратура адмовілася выпускаць экс-кандыдата на прэзыдэнта Аляксандра Казуліна з-пад варты: тэрмін сьледзтва працягнуты да 1 ліпеня. Абаронцы лідэра БСДП(Г) прасілі зьмяніць меру стрыманьня на іншую, не зьвязаную зь зьняволеньнем: яны спасылаліся на тое, што сьледчыя дзеяньні з удзелам Казуліна не вядуцца, а сам ён не ўяўляе пагрозы грамадзтву.

Наваполацкая недзяржаўная газэта **«Химик»** атрымала афіцыйнае папярэджаньне ад Мінінфармацыі, датаванае 12 траўня. Газэту вінавацяць, што надрукавала шэраг рэклямных абвестак пра ліцэнзаваную дзейнасьць без пацьверджаньня рэклямадаўцам права на ажыцьцяўленьне такой дзейнасьці, чым парушыла арт.30 закону «Аб друку і іншых СМІ». Галоўны рэдактар **Сяргей Балай** кажа, што ва ўсіх згаданых публікацыях такое пацьверджаньне было, і мае абскарджваць папярэджаньне.

У аршанскую пракуратуру выклікалі **Сяргея Каржова** і **Максіма Булыгіна**: іх дапытвалі пра дзейнасьць незарэгістраванага «Маладога фронту». Некалькі дзён перад тым на такі ж допыт выклікалі **Ігара Казьмерчака**.

Берасьцейскія ўлады забаранілі распаўсюджваць у абласной бібліятэчнай сетцы кнігу **Міколы Казлоўскага** «Украінскае адраджэньне на Берасьцейшчыне ў 80—90-х гадах ХХ стагодзьдзя», выдадзеную ўва Украіне.

### 24 траўня: Сасім — вязень сумленьня

«Міжнародная Амністыя» абвесьціла **Мікіту Сасіма**, асуджанага на 3 месяцы зьняволеньня, вязьнем сумленьня.

**Сяргея Чыгрына**, намесьніка галоўнага рэдактара «Газеты Слонімскай», выклікалі ў міжраённую пракуратуру: пракурораў цікавіў артыкул Чыгрына «Чыноўнікі мяняюцца, а горад застаецца» пра кадравыя перастаноўкі чыноўнікаў.

Суд Чыгуначнага раёну Гомелю задаволіў скаргу **Андрэя Аксёнава**, затрыманага 12 красавіка, і пастанавіў вярнуць яму канфіскаваныя тады газэты «Товарищ».

Асуджаны Лідзкім судом на 6 месяцаў арышту актывіст АГП **Іван Крук** абскардзіў вырак.

Гарадзенскі гарвыканкам заявіў **гарадзкой суполцы** незалежнага прафсаюзу **РЭП**, што лічыць немэтазгодным ставіць яе на ўлік.

У Гомелі **суполцы РЭП** у аўтапарку №1 адмовілі ў пастаноўцы на ўлік праз адсутнасьць «дастатковых падставаў».

У аршанскую пракуратуру выклікалі старшыню Свабоднага прафсаюзу мэталістаў (СПМ) **Васіля Леўчанкава**: памочніка пракурора спн.Корсак цікавілі прафсаюзныя дакумэнты суполкі СПМ на ўнітарным прадпрыемстве «Лёс».

### 25 траўня: справа Ляшкевіча

Магілёўская абласная пракуратура дапытала як сьведкаў у справе «Маладога фронту» шклоўскіх актывістаў **Валера Шапалава**, **Таццяну Буланаву**, **Алега Шэпана**.




**Флэш-моб у падтрымку палітвязьняў у Салігорску. 27 траўня.**

**Андрэй** і **Кацярына Толчыны** (муж і жонка) з Гомелю адмовіліся сплачваць штрафы, накладзеныя на іх за грамадзкую дзейнасьць: адміністрацыйная камісія Савецкага раёну Гомелю аштрафавала іх на 5 базавых велічыняў кожнага за «распаўсюд друкаваных выданьняў, выробленых з парушэньнем вызначанага парадку».

Гэтаксама ў Сьветлагорску **Натальля Бордак** адмовілася плаціць штраф у 2 б.в., накладзены за тое, што падчас выбарчай кампаніі плякат А.Мілінкевіча 5 хвілінаў стаяў «у непрызначаным месцы».

Моладзевую актывістку **Любоў Кучынскую** дапытаў сьледчы пракуратуры Цэнтральнага раёну Аляксандар Бачыла паводле ейнай заявы на незаконныя дзеяньні АМАПу: дзяўчыну зьбілі 10 траўня падчас разгону акцыі ў памяць Юр'я Захаранкі так, што яна трапіла ў бальніцу з дыягназам «гіпэртанічны крыз». «Сьледчы, — кажа дзяўчына, — не цікавіўся абставінамі зьбіваньня, а палохаў яе крымінальнай справай за «заведама хлусьлівыя паказаньні».

У Шчучынскім райсудзе 25 траўня пачаўся разгляд справы **Сяргея Ляшкевіча**, якога зьвінавацілі ў падрыхтоўцы да масавых беспарадкаў. У якасьці доказаў абвінавачаньня на судзе фігуравалі дакумэнтальны фільм «Звычайны прэзы-

# Самая масавая галадоўка

Працяг са старонкі 3.

сэсіі. Другая прычына разрозьненасьці галадоўнікаў — няма памяшканьня, дзе яны маглі б сабрацца разам.

Расьцяжку «Галадоўка», вывешаную салігорскімі актывістамі ў першы ж дзень на бальконе, зьнялі праз суткі з дапамогай крана работнікі ЖКГ. Цяпер яе замяніў бел-чырвона-белы сьцяг.

Найбольшую ўвагу да галадоўнікаў выяўляюць міліцыянты. 30 траўня зранку міліцыянт у форме і невядомы ў цывільным спрабавалі ўварвацца ў кватэру — давялося забарыкадаваць дзьверы. Тады міліцыянты зайшлі да суседзяў і праз пярэгарадку на бальконе маёр Мікалай Драбудзька пагражаў актывістам арыштам. Пасьля гэтага ў двары дому быў пакінуты пост з двух міліцыянтаў. 31 траўня міліцыянты зноў наведалі галадоўнікаў. «Падняўся да нас у люльцы крана чалавек у цывільным, мы яго гарбатай папаілі», — сьмяецца П.Батуеў.

Аднак улады не абмяжоўваюцца толькі міліцэйскімі візытамі. Другі дзень галадоўкі быў адзначаны зборам моладзі пад вокнамі галадоўнікаў: актывістам паведамілі, што яны «бээнэфаўцы» і «фашысты». Акрамя таго, Івану Шылу праз бацьку перадалі позву на допыт у пракуратуру: яго выклікалі як сьведку ў справе «Маладога фронту». Хлопец ісьці адмовіўся: «Мы перадалі ў пракуратуру свае патрабаваньні».

Цікавасьць да акцыі выказала і салігорская тэлевізія: здымачная група прыехала 30 траўня, калі на гаўбцы ў галадоўнікаў ужо вісеў бел-чырвона-белы сьцяг.

Сёлетняя моладзевая галадоўка — другая ў найноўшай беларускай гісторыі. Акурат год таму на знак пратэсту супраць беспадстаўных выключэньняў з навучальных установаў галадалі моладзевыя актывісты ў Жодзіне: яны пратрымаліся 11 дзён. Яўген Ваўкавец, удзельнік леташняй галадоўкі, кажа, што ганарыцца сваімі сябрамі: «Гэта крок адчаю, канечне. Але раз яны пайшлі на гэта, то цяпер павінны трымацца да апошняга. Мы раіліся зь сябрамі наконт таго, што галадоўка адбываецца ў розных месцах. Вядома, калі б былі ўсе разам, то лягчэй было б трымаць галадоўку».

Палітычныя галадоўкі ў Беларусі вядуць свой адлік з 1996 г., калі Юры Хадыка й Вячаслаў Сіўчык такім чынам дабіліся вызваленьня з турмы. Рэкордныя галадоўкі ў турме вытрымалі бізнэсоўцы Сяргей Скрабец і Мікалай Аўтуховіч, якія трапілі ў вязьніцу, паспрабаваўшы сябе ў палітыцы.

Такая масавая галадоўка моладзі ў Беларусі ладзіцца ўпершыню. Рэпрэсіі супраць яе ўдзельнікаў перад самітам «вялікай восемкі» ў Пецярбургу выклікаў бы міжнародны розгалас. Акцыя ўжо цяпер набыла маштаб, які выводзіць яе па-за межы ўласна беларускага кантэксту.

**Аркадзь Шанскі**

## ХРОНІКА РЭПРЭСІЙ І СУПРАЦІВУ 23 — 29 ТРАЎНЯ

дэнт» і відэакліпы зь фільму «Незвычайны канцэрт» з сцэнамі разгону дэманстрацыяў у Менску. 29 траўня Ляшкевіча прызналі вінаватым і прысудзілі да 5 месяцаў арышту.

Старшы ўпаўнаважаны крымінальнага вышуку РУУС Цэнтральнага раёну Менску дапытаў лідэра АГП **Анатоля Лябедзьку** наконт ягонага выкраданьня 26 красавіка. Лябедзька падаваў заяву ў гарадзкую пракуратуру, але тая перанакіравала дакумэнт у пракуратуру Цэнтральнага раёну, а адтуль заява трапіла ў РУУС.

Мін'юст падаў у Вярхоўны суд заяву, каб прыпыніць дзейнасьць **РГА «Беларускі Хэльсынскі камітэт»**: праваабаронцаў вінавацяць у парушэньні заканадаўства і ўласнага статуту. Мін'юст лічыць, што арганізацыя накіравала назіральнікамі на парлямэнцкія выбары ў кастрычніку 2004 г. асобаў, якія не ўваходзілі ў БХК, выкарыстоўвала жылыя памяшканьні для юрадрасоў філіяў і парушыла падатковае заканадаўства.

### 26 траўня: бел-чырвона-белы сьцяг на матчы

Па справе «Маладога фронту» ў Першамайскую пракуратуру Менску на допыт выкліканы **Ўладзімер Дубовік**.

Менгарсуд з ініцыятывы Менгарвыканкаму ліквідаваў пратэстанцкую царкву **«Запавет Хрыста»**, якая існавала з 1994 г. Падставай стала адсутнасьць юрадрасу: суполка зарэгістраваная на прыватнай кватэры пастара Георгія Вязоўскага. Гэта чацьвертая ліквідаваная пратэстанцкая суполка за 2006 г.

У Гомелі падчас футбольнага матчу паміж моладзевымі зборнымі Беларусі й Расеі быў затрыманы грамадзкі актывіст **Зьміцер Жалезьнічэнка**. Хлопец прыйшоў падтрымаць сваю каманду, але АМАПаўцы затрымалі яго за тое, што накінуў сабе на плечы нацыянальны бел-чырвона-белы сьцяг. У пастарунку на яго склалі пратакол за «выкарыстаньне незарэгістраванай сымболікі».

У Мастах сьледчы РАУС Дзьмітры Кулак дапытаў у якасьці сьведкі моладзевую актывістку **Вікторыю Салей** у справе незарэгістраванай арганізацыі незалежнага назіраньня «Партнэрства». Сьледчы намаўляў Вікторыю, каб 29 траўня наведала ваўкавыскі аддзел КДБ для размовы, але яна адмовілася ехаць бяз позвы. Дзяўчыне заявілі, што дазвольны штамп на выезд за мяжу (якога яна чакае ўжо другі месяц) паставяць у пашпарт толькі пасьля размовы ў КДБ.

У Бабруйску на сэсіі гарсавету аднагалосна звольнілі з працы дырэктара Ленінскага раённага жылкамунгасу, дэпутата, грамадзкага актывіста **Вячаслава Сьвізунова** за «невыкананьне загадаў, ігнараваньні нарадаў». Сам ён на паседжаньні сэсіі не прысутнічаў: быў шпіталізаваны з інсультам. Дэпутаты гарсавету не захацелі чакаць, пакуль Сьвізуноў выйдзе з больніцы. Сьвізуноў узначальваў гарадзкія філіі БНФ, Беларускай асацыяцыі журналістаў, выдаваў і рэдагаваў недзяржаўную газэту «Крынічка бабруйская». Ленінскі жылкамунгас Бабруйску ўзначаліў у сакавіку 2005 г., але ў лістападзе 2006 г. яго адхілілі ад дырэктарства: згоду на гэта тады далі таксама дэпутаты гарсавету. Бабруйскі гарсуд у студзені 2006 г. прызнаў звальненьне незаконным і аднавіў Сьвізунова на пасадзе.

Моладзевых актывістаў **Юр'я Гаўрыленку** і **Андрэя Станкевіча** адміністрацыйная камісія Жлобінскага райвыканкаму аштрафавала на 2 б.в. кожнага: 11 траўня іх затрымалі асобы ў цывільным, завезьлі ў пастарунак (дзе трымалі 5 гадзінаў) і зьвінавацілі ў вывешваньні абвестак у непрызначаных для гэтага месцах ды распаўсюдзе друкаваных выданьняў, «выробленых з парушэньнем вызначанага парадку».

### 29 траўня

У Гомелі суд Чыгуначнага раёну задаволіў скаргу прафсаюзнага актывіста **Аляксандра Еўсейчука**: ён патрабаваў прызнаць незаконным адміністрацыйнае пакараньне і скасаваць штраф 5 б.в., накладзены адміністрацыйнай камісіяй за распаўсюд звароту да работнікаў аўтапарку №1.

Дырэктара Незалежнага інстытуту сацыяльна-эканамічных і палітычных дасьледаваньняў, зарэгістраванага ў Літве, **Алега Манаева** выклікалі ў Генпракуратуру: сьледчы Станіслаў Новікаў цікавіўся «незаконнай» дзейнасьцю не зарэгістраванага ў Беларусі НІСЭПД і сацыялягічнымі дасьледаваньнямі Манаева наконт вынікаў прэзыдэнцкіх выбараў. Варта нагадаць, што зьвесткі, атрыманыя групай сацыёлягаў пад кіраўніцтвам А.Манаева, рэзка разыходзяцца з вынікам, абвешчаным Лідзіяй Ярмошынай.

Пракуратура Заводзкага раёну не знайшла парушэньняў у дзейнасьці супрацоўнікаў спэцпадразьдзяленьня па барацьбе з тэрарызмам «Алмаз», якія 25 сакавіка затрымалі **А.Казуліна**. Палітык скардзіўся, што яму траўмавалі руку кайданкамі і абыходзіліся зь ім абразьліва. Затое ў адказе пракуратуры называюцца імёны байцоў, што затрымлівалі кандыдата ў прэзыдэнты: гэта А.Дзядкоў, К.Цюшэўскі, І.Сафін, І.Бялясьнікаў, А.Баразінец. Каманду затрымліваць Казуліна даваў камандзір «Алмазу» Мікалай Карпянкоў, які ў той самы дзень пазьней страляў у машыну Юр'я Радзівіла. Ва ўсім гэтым удзельнічала намесьніца кіраўніка адміністрацыі Маскоўскага раёну Н.Гардзяюк, якая сустракала А.Казуліна на ўваходзе.

**АШ**

# Шантажом на шантаж

«Газпром» палохае газам ужо за 200 даляраў, беларуская мытня нагадала Расеі пра калінінградзкі транзыт.

У аўторак Ашмянская рэгіянальная мытня затрымала калінінградзкія фуры з падакцызным таварам. Інтэрнэт-газэта gazeta.ru паведаміла са словаў аўтаперавозчыкаў, што іх машыны беларускія мытнікі апячатваюць без тлумачэньня прычынаў.

У той жа вечар **Уладзімер Заламай**, кіраўнік калінінградзкага аддзяленьня пасольства Беларусі ў Расеі, патлумачыў, што мытнікі кіраваліся дэкрэтам А.Лукашэнкі, падпісаным яшчэ ў сьнежні 2005 году, згодна зь якім перавозка падакцызных тавараў павінна зьдзяйсьняцца пры ўмове сплаты мытаў, а таксама падлягае абавязковаму суправаджэньню Дэпартамэнтам аховы МУС РБ незалежна ад падачы мытным органам Беларусі фінансавых гарантыяў.

Па словах калінінградзкіх прадпрымальнікаў, на расейска-беларускай мяжы ніхто не прапаноўваў ім канваяваць фуры, а ўжо на беларуска-літоўскай мяжы машыны былі затрыманыя за адсутнасьць конвою.

Агенцтва фінансавых навінаў паведаміла пра скапленьне ў Ашмянах больш чым двухсот фураў. Але дзяжурны мытні паведаміў «Нашай Ніве», што затрыманыя ўсяго дзевяць машынаў. Калінінградзкія фуры маюць выпусьціць за мяжу, як толькі экспэдытары пакажуць дакумэнты аб мытным афармленьні гэтых грузаў у месцы іх атрыманьня.

Цікава, што за дзень да затрыманьня, у панядзелак, расейская газэта «КоммерсантЪ» з спасылкай на свае крыніцы паведаміла, што «Газпром» разглядае магчымасьці павелічэньня цаны на газ да 200 даляраў. Гэта ў 4,5 раза болей, чым цяпер. Раней «Газпром» вёў гаворку пра павелічэньне ў 3 разы. Паводле «Коммерсанта», прапановы цаны 200 даляраў былі перададзеныя беларускаму боку. У «Газпроме» гэтую інфармацыю не камэнтавалі, а кіраўнік «выканкаму саюзнай дзяржавы» **Павал Барадзін** выказаў меркаваньне, што канчатковую цану на газ вызначаць асабіста прэзыдэнты.

1 чэрвеня ў Маскву мае скіравацца на перамовы міністар энэргетыкі **Аляксандар Азярэц.**

Лідэр дэмакратычных сілаў **Аляксандар Мілінкевіч** заявіў, што абарона незалежнасьці павінна стаць нацыянальным прыярытэтам на бліжэйшы час. «Беларусь чакаюць цяжкія часы. Мы папярэджвалі пра гэта», — сказаў ён. У інтэрвію тэлеканалу «Эўраньюс», што трансьлявалася ў сераду, ён раскрытыкаваў негатоўнасьць уладаў да такога павароту падзеяў.

Разам з тым ён выказаў спадзяваньне, што Расея не зацікаўленая ў крызісе ў Беларусі. «Я спадзяюся, што ўсёткі Беларусь зможа дамовіцца з Расеяй, і цэны будуць уводзіцца паступова», — заявіў ён.

Віцэ-прэм᾿ер **Андрэй Кабякоў** паведаміў пра тое, што ўрад рыхтуе беспрэцэдэнтны пакет падатковых ільготаў для малых і сярэдніх прадпрыемстваў. Так, мяркуецца вызваліць малыя (да 15 занятых) прадпрыемствы ад вядзеньня бухгальтарскага ўліку і сплаты ПДВ, прызначыўшы для іх адзіны падатак у памеры 10% ад выручкі. Сувымерная лібэралізацыя чакае сярэднія (да 100 працоўных) фірмы. Гэткія меры могуць быць часткай падрыхтоўкі да крызісу буйной прамысловасьці, непазьбежнага ў выніку падаражэньня энэрганосьбітаў.

**Мікола Бугай**

# Мілінкевіч уганараваны прэміяй Фундацыі «Кран-Мантана»

Ён атрымаў прэмію форуму, на якім у свой час зладзілі абструкцыю А.Лукашэнку.

Як стала вядома «Нашай Ніве», Фундацыя сусьветнага форуму «Кран-Мантана» прысудзіла Аляксандру Мілінкевічу сваю штогадовую прэмію. Пра гэтае рашэньне А.Мілінкевічу паведаміў старшыня Фундацыі Жан-Поль Картэрон.

Прэмія прысуджаецца за вялікія заслугі ў справе барацьбы за мір, свабоду і дэмакратыю. Яна ўручаецца з 1989 году, і сярод яе ляўрэатаў былі Ангела Мэркель, Ясір Арафат, Зоран Джынджыч, Віктар Чарнамырдзін, Юлія Цімашэнка, Хуан-Антоніё Самаранч і яшчэ некалькі дзясяткаў палітычных і грамадзкіх дзеячаў з самай рознай, трэба прызнаць, рэпутацыяй.

Пікантнасьць сытуацыі надае той факт, што Форум «Кран-Мантана» быў адзіным сусьветным бізнэс-форумам, на якім пабываў Аляксандар Лукашэнка. Гэта было ў 1998 годзе. Пра ўдзел А.Лукашэнкі было дамоўлена падчас візыту Ж.П.Картэрона ў Менск. Хоць напярэдадні Форуму распачаўся скандал з высяленьнем заходніх дыпляматаў з Драздоў, паездка, тым ня менш, адбылася. Толькі скончылася яна скандалам. Калі ў часе дыскусіі адзін з францускіх удзельнікаў Форуму назваў беларускага прэзыдэнта дыктатарам і прадказаў, што ён скончыць свае дні, як усе дыктатары, А.Лукашэнка з словамі «От ваша хвалёная заходняя дэмакратыя» сарваў зь сябе слухаўкі і пакінуў залю паседжаньняў.

У той час на Захадзе і ў Беларусі гучалі галасы з асуджэньнем арганізатараў Форуму, што запрасілі ў Кран-Мантана прэзыдэнта краіны, якога ўжо тады на Захадзе называлі аўтакратам.

Сёлетняя цырымонія ўручэньня прэміяў адбудзецца ў рамках 17-й гадавой сэсіі Форуму «Кран-Мантана» ў Манака.

Як паведаміў «Нашай Ніве» памочнік А.Мілінкевіча Андрэй Кусяльчук, пакуль не вядома, ці лідэр дэмакратычных сілаў зможа прысутнічаць на цырымоніі ўручэньня прэміі асабіста. Ягоны графік на чэрвень зьбіты вельмі шчыльна.

**МБ**

# Людзі X

Анатоль Лябедзька зьвінавaціў Мілінкевіча ў «інстынкце самазахаваньня» 19 сакавіка. Рэпартаж **Зьмітра Ўласава** са зьезду АГП.

Плюс 8 — памежная тэмпэратура для жыцьця неапранутага чалавека. Плюс 8 — з такой перавагай Аляксандар Мілінкевіч выйграў у Анатоля Лябедзькі на кастрычніцкім Кангрэсе дэмакратычных сілаў. Стаўленьне значнай часткі сяброў Аб’яднанай грамадзянскай партыі да кампаніі адзінага кандыдата было параўнальным са станам чалавека на мяжы замярзаньня.

Ад нядзельнага X зьезду АГП чакалі добрага скандалу. Дзяржаўныя СМІ, што дружным натоўпам ламануліся па акрэдытацыю, не пралічыліся. Толькі прадбачлівая адмова дзяржаўным тэлеканалам не зрабіла мерапрыемства цьвіком этэру.

Ціхія крыўды пачалі выказвацца яшчэ пры рэгістрацыі дэлегатаў і гасьцей. Нікога зь VIP-пэрсонаў кааліцыі не было, затое прыехаў намесьнік Аляксандра Казуліна Ўладзімер Нісьцюк. Пазьней А.Лябедзька патлумачыў, што памяшканьне далі запозна і шмат каго зь лідэраў немагчыма было знайсьці. У кулюарах гаварылі адваротнае: ніхто асабліва шукаць і не імкнуўся.

Напярэдадні зьезду адзін з намесьнікаў старшыні АГП супакойваў: «Нікога ён «мачыць» ня будзе. Справаздача будзе спакойнай». Назваўшы сябе «аптымістам з крытычным ухілам», А.Лябедзька сапраўды ўжываў пугу і пернік як для сваіх, так і для чужых. «Я расчараваны шмат у кім: у сабе, часткова ў сваіх намесьніках, у сябрах партыі. Але я не расчараваны ў стратэгіі аб’яднаньня, якую мы ў свой час прапанавалі. Я не зьбіраюся быць Іванам Жахлівым, які забівае сваё ўласнае дзіця. Адны мы страцім ня толькі твар, але і саму партыю», — заявіў А.Лябедзька. Сваю партыю ён назваў «адказным партнэрам і галоўным інвэстарам працэсу кансалідацыі».

Паміж іншым, як адзначыў палітык, з «кааліцыйных структураў» дагэтуль не прагучаў «аб’ектыўны аналіз» працы падчас прэзыдэнцкай гонкі — «на лічбах, на фактах». «Як заўсёды: добры той, хто прыемны, і нядобры той, хто мае сваю пазыцыю», — заўважыў А.Лябедзька.

Найбольш жорсткай да лідэраў кааліцыі была тая частка прамовы, дзе вялося пра падзеі ў дзень выбараў: «Самае слабое месца — 19 сакавіка. Нізы чакалі, што рабіць, вярхі ня ведалі, што рабіць. Наверсе, відаць, спрацаваў інстынкт самазахаваньня, і гэта трэба прызнаць». Амаль нічога, паводле Лябедзькі, ня зроблена для інфармаваньня грамадзкасьці пра падзеі 19—25 сакавіка і дзеля «дэлегітымізацыі вынікаў выбараў». А запіс грамадзянаў у Мілінкевічавы рух «За свабоду» Лябедзька лічыць «прамой падставай», бо могуць прыцягнуць да адказнасьці за дзеяньні ад імя незарэгістраванай арганізацыі.

У той жа час лідэр АГП параіў не разглядаць яго палітыку як «працу з рыдлёўкай, што капае пад манумэнт». Ён выказаўся за правядзеньне новага Кангрэсу дэмсілаў, што было адлюстравана і ў рэзалюцыі X зьезду. «Калі Кангрэс вылучыў адзінага кандыдата, трэба зрабіць і справаздачу. Трэба ўлічваць і фактар Казуліна, за якога магла прагаласаваць траціна прыхільнікаў Мілінкевіча ў выпадку адсутнасьці апошняга. Выйдзе ён з турмы і скажа: яны ж нас не паклікалі. На НКДС трэба 50—60 прыхільнікаў Казуліна і 100—120 чалавек з Майдану. Гэта новая, жывая, неангажаваная кроў», — падкрэсьліў Лябедзька.

Напружанасьць у дыскусіі паводле справаздачы ўзрастала. «Людзі, што ўвайшлі ў аргкамітэт НКДС ад АГП, бязьдзейнічалі і не замінaлі прамым фальсыфікацыям з боку канкурэнта. Мілінкевіч выклаўся ў кампаніі настолькі, наколькі гэта неабходна ў Польшчы альбо ЗША, і дзякуй Казуліну за тое, што ён зьявіўся» (Юры Істомін). «Штаб адзінага кандыдата пасьля выбараў не зьбіраецца і не вырашае аніякіх пытаньняў» (Алена Залеская). «Жаночы рух у кааліцыі рэпрэзэнтаваны Валянцінай Матусевіч, за якой няма аніводнага чалавека» (Людміла Пеціна). «Намі скарысталіся, за наш кошт зьнялі вяршкі, АГП страціла свой аўтарытэт, і яе кіраўніцтва павінна сысьці ў адстаўку» (Марына Багдановіч). «Мілінкевіч ужо амаль пэнсіянэр, яму хутка 60 год. Анатоль Лябедзька — наш прэзыдэнт!» Апошнія словы з выступу Ніны Ермалінскай з Салігорску былі апагеем фронды. Галасоў у падтрымку кааліцыі было няшмат, у асноўным з боку тых, хто ў ёй і працаваў. Віктара Карняенку, Аляксандра Дабравольскага і Людмілу Гразнову сустракалі без фанатызму. Калі Карняенка змучана запытаўся, дык што ж трэба было рабіць 19-га, з залі пачуўся адказ: «Ставіць намёты!»

У заключным слове Лябедзька імкнуўся гуляць ролю добрага ката Леапольда, але кадравыя рашэньні зьезду (з пасадаў намесьнікаў сышлі сябры кааліцыі Аляксандар Дабравольскі і Сяргей Альфер, на іх месцы абраныя прыхільнікі партыйнага сувэрэнітэту Ігар Шынкарык і Ўладзімер Чырвоненка) пацьвердзілі, што структура АГП будзе дрэйфаваць у бок Казуліна. Нездарма ж вітальны выступ Нісьцюка сарваў ці ня самыя гучныя воплескі.




**Момант галасаваньня. У цэнтры — Анатоль Лябедзька, справа — Яраслаў Раманчук.**

# Дзяніс Дзянісаў: Пакуль не магу паведаміць падрабязнасьцяў

Лідэр намётавага мястэчка абяцае новыя акцыі за свабоду ў чэрвені.

Травеньскі зьезд Аб'яднанай грамадзянскай партыі падтрымаў курс Анатоля Лябедзькі: радыкальная апазыцыя Лукашэнку і ў той жа час непрызнаньне Мілінкевіча лідэрам незалежнага грамадзтва. Што пра гэта думае маладое пакаленьне АГПоўцаў? Карэспандэнт «НН» пагутарыў зь сябрам АГП Дзянісам Дзянісавым. 27-гадовы Дзяніс быў адною з жывых легендаў Плошчы. У той жа час ён крытычна паставіўся да заявы камэнданта намётавага мястэчка Алеся Мазура і ягоных паплечнікаў, якія запатрабавалі ад лідэраў апазыцыі больш рашучай падтрымкі Мілінкевіча і фармаваньня жорстка структураванага руху. «Гэта перацягваньне коўдры», — так назваў інтэрвію з А.Мазурам у «НН» ананімны карыстальнік «Жывога Журналу» ў Інтэрнэце, чый допіс быў перадрукаваны на сайце АГП.



20 сакавіка. Моладзь ставіць першыя намёты на Плошчы. Справа — Дзяніс Дзянісаў.

ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**«Наша Ніва»: Прайшоў зьезд АГП. Галасавалі за Лябедзьку?**

**Дзяніс Дзянісаў:** Я быў дэлегаваны на зьезд, але не прысутнічаў на ім. Сустракаўся з актывістамі моладзевых ініцыятываў, бо палічыў гэта важнейшай справай.

**«НН»: Навошта Вы тады сябар АГП, калі Вам зьезд партыі ня важны?**

**ДзДз:** Я не кажу, што гэта для мяне няважна. Але на сёньня праца менавіта з гэтымі людзьмі мне падаецца больш істотнай.

**«НН»: Але калі б на зьезьдзе былі, галасавалі б за Лябедзьку?**

**ДзДз:** За Лябедзьку.

**«НН»: Хоць ён і выступае за раскол?**

**ДзДз:** Гэта быў бы голас на карысьць лідэра партыі, а не агульнанацыянальнага лідэра апазыцыі. Дый тэрмін «раскол» тут не пасуе, бо апазыцыя па сутнасьці і не была аб'яднанай, каб яе можна было раскалоць. На маю думку, навідавоку не раскол, а наяўнасьць некалькіх апазыцыйных рухаў з падобнымі мэтамі, якім насьпеў час выпрацаваць правілы суіснаваньня ў канкурэнтнай барацьбе.

**«НН»: Барацьбе між сабою? Гэта барацьба ці дзяльба кабанчыка?**

**ДзДз:** Не, сапраўдная барацьба ня скончаная. Ад сакавіка безупынна ладзяцца флэш-мобы.

**«НН»: А Пазьняк кажа, што флэшмобы толькі адцягваюць моладзь ад нацыянальна-вызвольнага змаганьня. Што Вы адкажаце на гэта?**

**ДзДз:** Кожны мае займацца сваёй працай. Мы мабілізуем грамадзтва, у палітыкаў — свае задачы. Мы прыцягваем увагу грамадзтва да самых балючых пытаньняў. Флэш-моб з марозівам, напрыклад, — знак таго, што ня ўсё ў парадку з грамадзянскімі свабодамі. А праблемы незалежнай прэсы, рэпрэсаваных актывістаў? Акцыі трымаюць і іх удзельнікаў, і міжвольных сьведкаў у тонусе, не даюць закасьнець. Яны прыцягваюць у нашы шэрагі ўсё больш маладых людзей. Мэта грамадзянскага вулічнага пратэсту — давесьці грамадзтву абсурднасьць сыстэмы, паказаць, што мы ёсьць, што супраціў працягваецца. Мы — гэта актыўная моладзь, якая будзе працягваць барацьбу, не зважаючы на асаблівасьці палітычнага календара. А Пазьняк… Што, і важнасьць флэшмобу ў падтрымку «Нашай Нівы» ён таксама аспрэчвае?

**«НН»: Мы чулі пра ідэю асобных удзельнікаў Плошчы асабіста праехацца па краіне, каб распавесьці праўду пра намётавае мястэчка. Гэта будзе?**

**ДзДз:** Мы гатовыя. Прапрацоўваюцца апошнія тэхнічныя моманты. Магу сказаць, што ў бліжэйшы час распачнецца мабілізацыйная кампанія, у часе якой мы выявім сябе як арганізаваная сіла. З зразумелых прычынаў не магу пакуль паведаміць падрабязнасьцяў.

**Гутарыў Сямён Печанко**

**Дзяніс Дзянісаў**

27-гадовы студэнт. Нарадзіўся ў Віцебску. Сябар Аб'яднанай грамадзянскай партыі, лідэр моладзевага руху. 20 сакавіка паставіў адну зь першых палатак на цэнтральнай плошчы Менску.

# Каб штотыдзень атрымліваць газэту, дасылайце адрасы і прыватныя ахвяраваньні

Каб гарантавана чытаць «Нашу Ніву» цяпер, калі «Саюздрукам» і «Белпошце» забаронена распаўсюджваць газэту:

1) Просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць па тэлефоне, факсам, праз пошту ці электронную пошту.**
Тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32 (МТС), (029) 618-54-84
e-mail: dastauka@tut.by
паштовы адрас: а/с 537, 220050 Менск.

2) Просім кожную сям'ю чытачоў **пералічваць на рахунак** газэты ахвяраваньне з разьліку 6 000 рублёў на месяц. Гэтага будзе досыць для выхаду і дастаўкі газэты. **У блянку банкаўскага паведамленьня ці паштовага пераказу, калі ласка, дакладна і разборліва пазначайце ваш адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.** Тыя, хто перакажа 18 000 рублёў за раз, забясьпечаць выхад газэты на тры месяцы. Хто ж мае магчымасьць пераказаць 36 000 рублёў адразу, забясьпечаць публікацыю «НН» адразу на паўгоду.


0402280179
ИЗВЕЩЕНИЕ
Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521
получатель платежа
МГД ААТ «Белінвестбанк», вул.Калектарная, 11, Мінск, код 764
наименование банка
Счет получателя: 3015 212 000 012
Лицевой счет
(фамилия, имя, отчество, адрес)
Вид платежа | Дата | Сумма
Ахвяраваньне
Пеня
Всего
Кассир
Плательщик

Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521
получатель платежа
МГД ААТ «Белінвестбанк», вул.Калектарная, 11, Мінск, код 764
наименование банка
Счет получателя: 3015 212 000 012
Лицевой счет
(фамилия, имя, отчество, адрес)
Вид платежа | Дата | Сумма
КВИТАНЦИЯ
Ахвяраваньне
Пеня
Всего
Кассир М.П. Плательщик

## На які рахунак пералічаць грошы?

Ахвяраваньне можна перавесьці ў любым аддзяленьні банку, на любой пошце. Улічыце, што пры пераказваньні грошай паштовым пераводам пошта спаганяе дадаткова 3%, а пры пераводзе грошай праз «Беларусбанк» працэнту не бяруць.
На банкаўскай квітанцыі ў графе «Від плацяжа» трэба пазначыць: «Ахвяраваньне». У графе: «Атрымальнік плацяжа» трэба пісаць: «Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521». У графе «Найменаваньне банку» трэба пісаць: «МГД ААТ «Белінвестбанк», вул.Калектарная, 11, Мінск, код 764». У графе «Рахунак атрымальніка» 3015 212 000 012. Пры перасылцы грошай па пошце тое самае трэба пісаць у рубрыках «Каму» і «Куды».

## Ці трэба паўторна дасылаць адрасы ў Рэдакцыю?

Не, аднойчы даслаўшы, больш ня трэба (калі вы рэгулярна атрымліваеце газэту). Тады досыць не забывацца рэгулярна пералічаць ахвяраваньні.

## Хто дасылаў ахвяраваньні, але не паведаміў адрасу

Прабачце, што газэта прыйшла вам запозьнена. Рэч у тым, што вы пераказалі ахвяраваньне, але не паведамілі Рэдакцыі адрасу адразу. Квіток ахвяраваньня трапляе да нас праз 5—10, а часам і болей дзён.

# 1+3 Беларусь — Швэцыя

**1 (чц) чэрвеня**

а 19–й у менскім касьцёле Сьв.Сымона і Алены — беларуска–швэдзкія паэтычныя чытаньні.

**Удзел бяруць Рыгор Барадулін, Оса Марыя Крафт, Хокан Бравінгер, Аляксандра Крунквіст.**

Арганізатары: касьцёл Сьв.Сымона і Алены, Аддзяленьне Пасольства Швэцыі ў Менску, Швэдзкі інстытут (Стакгольм). Прадусэры: Марыя Сёдэрбэрг 632–67–55 info@mariafoto.se

Даніель Густаўсан, Швэдзкі інстытут 453–78–00 www.si.se

Па інфармацыю зьвяртацца:

Аддзяленьне Пасольства Швэцыі ў Менску 226–55–40; www.kalegium.org, www.vitryssland.nu

## Шукаем валантэраў для распаўсюду газэты ў розных раёнах Менску.

запрашаем прыватных прадпрымальнікаў

браць газэту на распаўсюд у Менску і рэгіёнах.

**Вельмі просім чытачоў, якія чытаюць «НН» у Інтэрнэце, а не на паперы, таксама дасылаць прыватныя ахвяраваньні з разьліку 6000 на месяц з пазнакай: «за Інтэрнэт». Бяз збору грошай газэце не захаваць якасьці.**

## Шчыры дзякуй за шчодрасьць

**Ж.К., І.Х.** зь Менскага раёну.
**Вользе П.** з Маладэчанскага раёну.
**Аксане Г.** з Смалявіцкага раёну.
**Сяргею С.** з Полацку.
**Сяргею К., Андрэю Ф.** з Горадні.
**Зьмітру К.** з Мастоў.
**С.К.** зь Пінску.
**Валер'ю П.** з Баранавічаў.
**В.Д.** з Барысава.
**В.Б.** з Ваўкавыску.
**Алесю Р.** з Наваполацку.
**Ірыне Ц.** з Жыткавічаў.
**Анатолю С.** з Магілёва.
**І.З.** з Горак.
**Мікалаю Ж., Кацярыне К., Зьмітру Т., І.Я., Валянціне Ш., Маўлюдзе А., Галіне Ж., Анатолю С., В.Б., А.Ф., А.Л., Вераніцы З., Алене К., Эдуарду К., Уладзімеру Р., Валянціне Ш., Аўгену Ш., Анатолю М., Сяргею П., Яраславу К., Рэгіне К., С.Д., Міхаілу Ш.** зь Менску.

# Цуды ў Пустынках

Цуд у самым усходнім манастыры Беларусі. Рэпартаж **Сяргея Харэўскага** з Амсьціслава.

Пайшла пагалоска, нібы ва Ўсьпенскім манастыры, што ля вёскі Пустынкі на Амсьціслаўшчыне, адкрыўся нерукатворны абраз Хрыста Збаўцы. Уласна гэта я і хацеў спраўдзіць. А таксама адведаць тыя мясьціны, дзе не бываў паўтара дзясятка гадоў. Вёска Пустынкі ляжыць на самай мяжы з Расеяй, напрасткі — пару сотняў мэтраў. Напрыканцы 1980-х тут і абрывалася дарога ў нікуды: спачатку асфальт станавіўся танчэйшы, пасьля жвір пераходзіў у пыл, а там — нішто... Грамадзкі транспарт перастаў тут хадзіць яшчэ за савецкім часам.



Трыццацімэтровая манастырская званіца ўжо бачная, а да Пустынак яшчэ паўгадзіны хады.

## Заснаваны катам хрысьціянаў

Сярод разлогаў тамтэйшых дуброваў у 1380 годзе амсьціслаўскі князь Лугвен, сын вялікага князя Альгерда, муж унучкі Дзьмітрыя Данскога, заснаваў першы ў тамтэйшых ваколіцах манастыр. Нагодаю стала дзіўнае здарэньне: князь Лугвен, паганскае веры, быў моцна хворы на вочы. Ён нават ужо страціў быў зрок. Але ў сьне яму зьявіўся вяшчун і абвесьціў: «Калі хочаш бачыць наноў — хадзі ў пустэльню і памыйся вадой з крыніцы, тады атрымаеш жаданае». Князь Лугвен знайшоў тую крыніцу, што напрарочыў яму сон. Абмыўшы вочы, князь вярнуў зрок і ўбачыў між шатаў старадаўніх ліпаў абраз Маці Божае. Ён адразу ж прыняў сьвяты хрост, атрымаўшы імя Сямён. А на месцы свайго цудоўнага збавеньня заснаваў манастыр.

Дзякуючы шматлікім цудам выздараўленьня пры сьвятой крыніцы гэты прыстанак меў шчодрыя фундушы. Ужо ў XV ст. манастыр славіўся сваім багацьцем. Падчас Лівонскае вайны, у 1560 годзе, Сьвятаўсьпенскі манастыр разрабавала й спаліла маскоўскае войска. У 1578 годзе кароль Сьцяпан Батура шчодра абдарыў сьвятыню й перадаў манастыр полацкаму архіяпіскапу.

Гэты манастыр стаў трывалым апірышчам уніі, стаўшы адным зь першых прыстанкаў айцоў-базылянаў. Велізарны мураваны Сьвятўсьпенскі сабор пачалі будаваць на сродкі дабрачынца Гайка ў 1801 годзе, а скончылі ў 1808-м. Тады ж ён быў асьвячоны полацкім уніяцкім арцыбіскупам Іраклієм Лісоўскім — адным з апошніх дзейных і дальнабачных абаронцаў уніі.

## Лазьня ў царкве

Цяпер галоўны сабор манастыра амаль зруйнаваны: даўно няма даху,

Працяг на старонцы 14.

# Цуды ў Пустынках

**Працяг са старонкі 13.**

праз скляпеньні прарасьлі дрэвы. Пра колішняе хараство й веліч нагадваюць велізарныя круглыя вокнылюкарны ў фасадах прэзьбітэрыя й сакавітая ракайльная плястыка галоўнага аўтара, што ўжо даўно служыць адно дзікім птахам.

У такія ж руіны ператвораныя й іншыя пабудовы: Раствабагародзіцкая царква, кялейны корпус з Пакроўскай царквою, званіца, школа, капліцы, гаспадарчыя і жылыя дамы. І віною тут не расейскія наезды, што тройчы спусташалі гэты манастыр у XVII—XVIII стагодзьдзях.

Пасьля закрыцьця манастыра савецкаю ўладаю чаго толькі ні было ў гэтых мурах: калёнія для непаўналетніх, сядзіба калгасу з хлявамі, па вайне — прытулак сіротаў, затым — дом састарэлых...

Недзе ў 1970-я гады мясцовае начальства абсталявала тут сабе шыкоўную лазьню на сьвятой крыніцы князя Лугвена, пераабсталяваўшы Раствабагародзіцкую царкву, што пад стромым пагоркам манастырскай плошчы. Але неўзабаве быў «сыгнал» «куды трэба», і аматараў парыцца ў царкоўных мурах пакаралі. А заадно — раскідалі дашчэнту саму сьвятыню, з-пад якое цурчэла крыніца.



**Нерукатворны абраз праступае праз тынк.**

## За Віхрою, на Падоле

Паўтара дзясятка гадоў таму на гэтым месцы была вусьціш запусьценьня, кучы камунальна-калгаснага хлуду. Высачэзная званіца, што пануе над навакольлем, была ў катастрафічным стане: зь яе трыццаціметровай вышыні раз-пораз падалі долу кавалкі цэглы. Заставалася толькі разводзіць рукамі й пагаджацца з тым, што нічога тут зрабіць немагчыма... Пра турыстаў у гэтым ці ня самым аддаленым куце Беларусі гаварыць было сьмешна, а пра аднаўленьне манастыра за савецкім часам — яшчэ сьмяшней...

Калі спусьціцца з Амсьціслава на Падол, цераз рэчку Віхру перайсьці на Зарэчча, то дарога ізноў будзе паволі ўздымацца дагары. На гары, за паваротам, дакуль вас праводзіць сымпатычны белы сабака, усё, што нагадвае пра нашае паўсядзённае жыцьцё, зьнікае. Навокал — дзясяткі кілямэтраў густых дуброваў і балацінаў. Рэдкія тут у будні машыны зусім зьнікаюць у выхадныя. Ад цішыні аж цісьне ў вушах. На колішніх калгасных палетках — таксама ціш. Прынамсі прайшоўшы ад Амсьціслава да Пустынак тузін кілямэтраў, ніякіх сьлядоў гаспадарчае дзейнасьці ня ўбачыш.

## Цуд першы

Праз гадзіну хады, што з вамі разьдзеляць толькі дзікія зьвяры й птушкі, на даляглядзе зьявіцца зіхоткі залаты крыж у небе. Нібы сьвятло маяка ў зялёнай пустыні.

Манастырская званіца, танкая й стромая, як аловак, цяпер шпарка аднаўляецца. Як толькі яна пакажацца — хады да яе яшчэ паўгадзіны. Ахайна заасфальтаваная пляцоўка пе-



**Руіны Ўсьпенскага сабору. Сакавітая ракайльная плястыка галоўнага аўтара даўно служыць адно дзікім птахам.**

рад манастыром суботнім вечарам поўная машынаў. Палова — з расейскімі нумарамі. Але, насуперак чаканьням, аніякага тлуму ў манастыры няма.

Абсягі ягоныя велізарныя. Тут разьбягаюцца падмеценыя цяпер сьцяжыны празь вялікі сад уздоўж велічных руінаў і толькі адноўленых будынкаў. Вакол манастыра — даўжэзныя вялікія валы, равы, ставы. А за ім — рака Асьлянка, берагі якое хаваюцца ў дрымучым лесе.

## Цуд другі

У адноўленай царкве на месцы крыніцы, дзе, паводле паданьня, князю Лугвену зьявіўся абраз Маці Божай (пра што дэталёва па-беларуску паведамляе адмысловая таблічка), ідзе набажэнства.

У царкве — манахі, паслушнікі ды купка пілігрымаў.

Сьвятая крыніца, што цячэ з-пад царквы, ахайна спарадкаваная. На камяністым дне зіхцяць манэткі. Расейскія, польскія, украінскія, літоўскія. Можна напіцца й набраць вады.

За два крокі — купальня, над якой узьвялі імпазантны павільёнчык. Там людзей ня менш, чым у царкве. Мужчынская зьмена. Бадзёрыя людзі пераконваюць адзін аднаго, што ім стала па купаньні значна лепей.

Адзін пілігрым зь Пецярбургу, заўзяты тут купальшчык (толькі гэтай зімою на Вадохрышча пабаяўся лютага марозу) красамоўна распавёў, як пазалетась адбывалася вялікая ўрачыстасьць высьвячэньня гэтае царквы над крыніцаю.

Вада й праўда вельмі смачная. Няма сумневу, што й купаньне ў крынічнай вадзе карыснае.

## Цуд трэці

Ці бачылі нерукатворны абраз? Усе бачылі. А вы самі зайдзіце ў стары кялейны будынак, каля званіцы, там усё адчынена. У нас усё адчынена. Самі знойдзеце. Там убачыце вобраз Збаўцы. Маладзенькі манашак, які прадае сьвечкі ў царкве, спакойна й годна, з замілаванай усьмешкаю інструктуе.

І праўда, усе дзьверы ў гэтым манастыры адчыненыя. Нядоўга шукаючы, знойдзеце й тую цэлю, перакрытую магутнымі крыжовымі скляпеньнямі. Падмеценая падлога, памытыя вокны. Наваскладзеная печ са старасьвецкім комінам. Старая мажная канапа ў куце. На падваконьні — вялікі драўляны складзень з выявамі Хрыста, сьвятога Мікалая й сьвятога Юр'я. Рэч старасьвецкая, народная. Тутсама й ручнікі ў старых саматужных карунках, бронзавы крыж, пэўна, знойдзены ў зямлі… А зьлева на сьцяне… выява Хрыста Збаўцы. Сэрца міжволі скаланулася. Выява вельмі выразная й прыгожая. І… нерукатворная. У тым сэнсе, прынамсі, што яна не намаляваная цяпер. І няма знаку самога маляваньня. З-пад слою крэйдавых фарбаў на старасьвецкім тынку XIX стагодзьдзя выразна праступае сьвятое аблічча. У поўнай цішы старасьвецкіх муроў сам-насам са Збавіцелем нерукатворным.

## Цуд вяртаньня

Ведама ж, можна знайсьці вытлумачэньне ўсяму. Пэўна, клясычная выява Хрыста на хусьцінцы была напісаная ў акадэмічнай манеры ў сярэдзіне пазамінулага стагодзьдзя алейнымі фарбамі па старым тынку. Ад неспрыяльных умоваў фарба адлушчылася, але, у выніку хімічнай рэакцыі, мэталы, што былі ў фарбах, уеліся ў тынк… Але гэта не тлумачыць, чаму выява засталася настолькі ясная і выразная! Чаму яна захавалася сама меней праз паўтары сотні гадоў? І галоўнае — чаму яна адкрылася толькі цяпер, менавіта ў наш час і менавіта нам? І чаму нават скептык прасякаецца міжволі піетэтам перад гэтак непрэтэнцыйнай выяваю?..

Пэўна, таму што адбыўся найвялікшы цуд — цуд вяртаньня й адраджэньня сьвятыняў у нашым краі. І тыя цуды, што зьдзіўлялі нашых продкаў, дзівяць і нашых дзяцей.

**Здымкі Веранікі Дзядок**

**На пляцоўцы перад манастыром заўжды ёсьць машыны паломнікаў.**



**Адноўленая царква Раства Багародзіцы, з-пад якой цячэ сьвятая крыніца. Унізе на фота — купальня. Ручай упадае ў рэчку Асьлянку за якой — Расея.**





# Усе ў пастцы

Самае прыкрае, што пытаньне пра белы сьцяг залежыць ад камэнданта беларускае фартэцыі. Піша **Аляксандар Класкоўскі.**

Нашы дзяржаўныя мэдыі вінавацяць за нагнятаньне газавых жарсьцяў «нячэсных» маскоўскіх пісакаў. Адкуль, маўляў, высмакталі аж 200 даляраў кошту (апошняя вэрсія расейскага ўльтыматуму)?

Але, колькі ні спрабуй перавесьці стрэлкі, упартым фактам застаецца тое, што пра эўрапейскія кошты для Беларусі першым сказаў дзядзька Мілер.

Разам з тым маскоўскія дзядзькі выдатна разумеюць, што $200 беларуская эканоміка не пацягне. Чаго ж яны хочуць?

Сярод палітыкаў ды палітолягаў гуляе слоўца «аншлюс». Пра яго высокую імавернасьць кажуць аўтарытэтныя фігуры — ад расейца Піянткоўскага да немца Рара.

Меркаваны мэханізм: беларускага прэзыдэнта схіляць да канстытуцыйнага акту на ўмовах Крамля, астатняе ж будзе справай тэхнікі.

Многім падаецца, што Менск трапіў у пастку саюзнай дамовы. Зьявілася нават вэрсія, што ў дасланым нядаўна канфідэнцыйным лісьце расейскаму калегу прэм'ер Сідорскі прыгразіў дэнансацыяй гэтай дамовы, калі надта задзяруць газавыя кошты.

Тут можна згадзіцца зь дзяржаўнай прэсаю: ніхто Сідорскаму гуляць у такія гульні не дазволіць. Бо ў краіне, як вядома, толькі адзін палітык. І вось ён, калі што, сапраўды можа адстраляцца па Крамлі ўсім боезапасам контраргумэнтаў.

Дарэчы, апошняе апытаньне пад эгідай групы Манаева засьведчыла, што ў гэтым сэнсе ў афіцыйнага Менску надзейны тыл. 61,3% рэспандэнтаў лічаць, што не палюдзку дзерці з найлепшага хаўрусьніка столькі ж, як з астатніх пакупнікоў «блакітнага паліва». 58% за тое, каб выставіць Маскве круты сустрэчны рахунак. Нарэшце, тае думкі, што «Белтрансгаз» нельга прадаваць ні ў якім разе, прытрымліваюцца аж 82% беларусаў! Карацей, у выпадку новай газавай вайны народ падтрымае кіраўніцтва.

Калі ўжо на тое, дык у пастцы саюзнай дамовы найхутчэй што апынаецца Крэмль. Пад звон чарак дзядуля Ельцын шчодра падмахнуў некалі паперу, дзе сапраўды замацаваныя прынцыпы фармальнай роўнасьці. Вось гэтай паперчынай, як даводзіць, у прыватнасьці, наш экспэрт Валер Карбалевіч, Лукашэнка і будзе біць Маскву да апошняга. Парадаксальна, але бюракратычныя навароты «братняй інтэграцыі» могуць аб'ектыўна паспрыяць абароне сувэрэнітэту.

Кіроўная каманда зусім не зацікаўлена здаваць някепска абсталяваную сувэрэнную фартэцыю. Ёсьць імавернасьць таго, што ў выніку чарговага крызісу Менск і Масква



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

праста зробяць крок да болей натуральных, прагматычных, сапраўды міждзяржаўных стасункаў. Гэта крок да таго, за што і змагаюцца столькі гадоў апанэнты рэжыму.

У гэтай схеме ёсьць хіба адзін прыкры момант. Усё залежыць ад камэнданта фартэцыі. А раптам нейкія забойчыя аргумэнты Крамля змусяць выкінуць белы сьцяг?

У краіны няма дэмакратычнага мэханізму абароны незалежнасьці. Яе адэптам застаецца адно што намякаць на партызанскія традыцыі ці прасіць гарантыяў ад аншлюсу на Захадзе. На такім тле трохі штучнымі выглядаюць спробы рангаваць гэтыя два паняткі — незалежнасьць і дэмакратыя.



**Дні МТЗ у Менску. Калі Расея ўзьвіньціць цэны на энэрганосьбіты, гэтае сьвята можа застацца ў гісторыі як лебядзіная песьня трактарнага заводу.**

# Кнопка Мілера



Выведзены лічбавы эквівалент беларуска–расейскага сяброўства. Фэльетон **Лёліка Ушкіна.**

Канцлер Сідорскі падкінуў Фрадкову страшэнную інфармацыю: калі цана куба газу стане 150 баксаў, беларуска-расейскаму братэрству — кранты.

Калі гэта сапраўды так і мы экстрапалюем усю гаму эмацыйных пачуцьцяў на цэны, можна вывесьці ўмоўную адзінку прывабнасьці расейцаў у вачах беларусаў — даляракубамэтар. Прасьцей кажучы: чым болей трэба плаціць за блакітнае паліва, тым мы больш ненавідзім расейцаў. І наадварот.

З аднаго боку, гэта супэрпрарыў у сусьветнай гістарыяграфіі — выведзены лічбавы эквівалент беларуска-расейскага каханьня. Цяпер гісторыкам будзе прасьцей ацэньваць эпізоды беларуска-расейскіх адносінаў. Напрыклад, Аршанская бітва — узровень сяброўства 250 баксаў за куб, пабудова камбінату «Азот» — 12 баксаў за куб і г.д.

Аднак адкрыцьцё Сідорскага выглядае не такім ужо і бяскрыўдным. Выходзіць, расейцы могуць лёгка маніпуляваць намі. Напрыклад, напярэдадні нейкага адказнага матчу па хакеі паміж зборнымі РФ і РБ, Мілер скідае кошт за пастаўкі газу да 5 баксаў. Натуральна, у беларускіх хакеістаў у галовах клініць і, замест таго каб смачна прыпячатаць суперніка, наш абаронца пачынае яго цалаваць са сьлязамі на вачах — «сябра, братка, славянін!».

Аднак самае страшнае, калі вэнтыль «Газпрому» акажацца ў руках шызіка. Ён жа можа проста загнаць нас у эмацыйны ступар! Зранку прачынаесься — кошт за газ 25 баксаў. Супэрнастрой. Жаданьне бегчы да маскоўскага цягніка з букетам ружаў. Толькі выйшаў з дому — па эфэму інфа: «Газпром» падняў цэны да 300 баксаў. У душы ўсё кіпіць: хапаеш сякеру і з крыкам «Біце ў сэрцы іх, біце мячамі!» ляціш да расейскага пасольства. Толькі ўздымаеш — цана падае да ста пяцідзесяці... Натуральна, такія эмацыйныя пераскокі адбіваюцца на дэмаграфічнай сытуацыі і пасяўной. За тры дні такога экспэрымэнту Беларусь ператворыцца ў край нэўротыкаў...

І пакутаваць нам яшчэ, сябры, досыць доўга. Па падліках вучоных, газу на Зямлі засталося яшчэ на 150 гадоў.

**13 чэрвеня**

Польскі інстытут у Менску запрашае

# Вечарына польскай і беларускай паэзіі

**Прэзэнтацыя кнігі выбраных твораў Канстанты Ільдэфанса Галчыньскага «Сёмае неба»** з удзелам перакладчыкаў Лявона Баршчэўскага, Леаніда Дранька-Майсюка, Марыйкі Мартысевіч, Андрэя Хадановіча ды інш.

**Прэзэнтацыя новай сэрыі «Biblioteka bialoruska»**, у якой выйшлі кнігі Васіля Быкава й Рыгора Барадуліна «Калі рукаюцца душы» і Уладзімера Арлова «Каханак яе вялікасьці» ў польскім перакладзе, а таксама дзьвюхмоўная кніга Андрэя Хадановіча «Калядны рэп/Swieta Nowego Rocku». Мяркуецца ўдзел Ірыны Міхайлаўны Быкавай, Рыгора Барадуліна, Уладзімера Арлова й Андрэя Хадановіча.

вул.Маркса, 31, філфак, актавая заля.

**18.00**

Уваход вольны.

## Будкін наблытаў

**У артыкуле сп.С.Будкіна «Модная мова» («НН», №16) лідэрам польскае групы *Big Cyc* і выканаўцам беларускамоўнае вэрсіі песьні «Дыктатар» названы Кшыштаф Скіба.**

Аднак жа пры ўсёй маёй павазе да творчасьці сп.Скібы і ягонае ролі ў гурце ў «Дыктатары», як і ў бальшыні астатніх песень каманды, салюе Джэй Джэй *Jacek Jedrzejak*, якому й давялося інтэнсіўна засвойваць нашую мову і які ёсьць сапраўдным лідэрам групы (інфармацыя аб чым зьмешчаная на афіцыйным сайце *Big Cyc'a* (www.bigcyc.pl) у разьдзеле *Aktualnosci*). А што да іх новага, 14-га, альбому, «які мае выйсьці днямі», дык на момант выхаду згаданага нумару «НН» ён ужо зь месяц як прадаваўся ў польскіх дыскарнях, у адной зь якіх я й ашчасьлівіла сябе набыцьцём плыткі мае ўлюбёнае каманды. Дый «Дыктатар» гучыць на ёй усё-ткі не па-беларуску, а на мове Віславы Шымборскай і Тадэвуша Рыдзыка.

Лічу, што да іншаземных музыкаў, якія шчыра турбуюцца пазытыўнымі пераменамі ў нашай краіне, можна было б паставіцца й больш уважліва.

**Абураная аматарка**

## Таямніца «Коду да Вінчы»

**«Код да Вінчы» можна назваць лухтой. Але калі на гэты фільм імкнуцца трапіць людзі, калі нехта яго забараняе, гэта ўжо сур'ёзна. У чым жа прычына шуму вакол гэта твору?**

Многія з тых, хто называе сябе хрысьціянамі, зьяўляюцца імі, як зазначыў Янка Маўр, «толькі па назьве». І сапраўды: ці многія, хто называе сябе хрысьціянамі, вызнаюць еднасьць з галілейскімі рыбарамі і блудніцамі!? Іншая справа — князёўна-багіня...

Разважаць аб спадкаемцах Ісуса — значыць не разумець сутнасьці Эвангельля, дзе усе царствы названыя ўладаньнямі «князя гэтага сьвету». Словы пра кесара адрасаваныя фарысэям і ўтрымліваюць відавочную іронію…

Шукаць гістарычнай праўды ў гностыкаў — спосаб яшчэ больш марны. Для іх Хрыстос увогуле ня быў целам. У гнастычных кніжках гаворыцца, што Ісус не пакідаў ценю, ня еў... Пра які шлюб тут можна казаць? Цікаўных адсылаю да кнігі Сьвянціцкай «Таемныя пісаньні першых хрысьціян».

Праўда не ў гарэзіі і не ў артадоксіі, а толькі ў самім жыцьці.

**Усяслаў Шатэрнік, Менск**

## «Не прыпісвайце — і не прыпісана й вам будзе!»

**Віталь Тарас у «НН» №19 заявіў: «Журналіст Аляксандар Фядута на сайце «Наша думка» пісаў, што абраза пачуцьцяў вернікаў ня можа мець апраўданьня і ўчынак апазыцыйнай газэты заслугоўвае адназначнага асуджэньня». Разам з гэтым сп.Тарас ня ўважыў за патрэбнае хоць бы працытаваць словы таго самага журналіста.**

Я меркаваў і мяркую зараз, што ў такіх разох — калі ты палемізуеш з чыімісьці словамі — цытаваць неабходна. Таму мушу працытаваць самога сябе наўздагон цягніку сп.Тараса:

«Я асуджаю рэлігійных фанатыкаў, якія даказваюць такім страшным чынам, што хрысьціяне зьняважылі іх веру. Але я асуджаю і тых, хто — ведаючы пра тое — працягвае тыражаваць гэтыя непамысныя малюнкі».

Паўтаруся: я асуджаў і асуджаю палітычны акт, зьдзейсьнены чалавекам, які іранізуе над чужой верай і нават не спрабуе пры гэтым зразумець, што ж менавіта так зьняважыла вернікаў. І зусім не адпрэчваю права публікаваць ЛЮБЫЯ тэксты, што не пярэчаць закону. Гэтага сп.Тарас заўважаць не жадае.

Акрамя таго, ён не жадае заўважаць і таго палітычнага кантэксту, у каторым сп.Зьдзьвіжкоў апублікаваў славутыя карыкатуры. Алесь Кудрыцкі ў «НН» надрукаваў пераканаўчы аналіз той сытуацыі.

На жаль, тады мае прагнозы збыліся. Газэту «Згода» закрылі. Хто скажа, што ад гэтага выйграла свабода слова ці свабода сумленьня? І хто скажа, што віноўнікам гэтага закрыцьця быў не сп.Зьдзьвіжкоў, які СЬВЯДОМА апублікаваў карыкатуры, што сталі нагодай для закрыцьця газэты, у якой ён рабіў?

Сп.Тарас такі ветлівы, што прызнае: «Трэба аддаць належнае Фядуту: ён і ўсе тыя, хто разважае падобным чынам, у адрозьненьне ад ісламскіх фундамэнталістаў, не патрабуюць пакараць сьмерцю аўтараў малюнкаў ці рэдактараў газэтаў».

Віталь Валянцінавіч, вы хоць бы працыталі тут артыкул, які маеце на ўвазе: «Усё вышэй сказанае ня значыць, што БАЖ ня мусіць абараняць права сп.Зьдзьвіжкова заставацца на волі. Глупства і правакацыя, ім учыненыя, не адпрэчваюць прафэсійных стасункаў «журналіст — карпарацыйная арганізацыя».

То бок, «фундамэнталіст» Фядута заклікае БАЖ абараняць правы сп.Зьдзьвіжкова. Гэта выклікае ў сп.Тараса іронію? Яго права. Але ня варта падманваць чытача, прыпісваючы мне тое, чаго я ня меў наўвеце і нават не пісаў.

Прасьцей ад усё выдаць уласныя думкі за думкі апанэнта і спрачацца зь імі. Але гэта — маніпуляцыя грамадзкай думкай.

Ксёндз Уладыслаў Завальнюк, тэоляг Пётра Рудкоўскі і неўцаркоўлены (паводле словаў уладыкі Філарэта) праваслаўны Аляксандар Фядута не спрабуюць, стасоўна пытаньняў веры, маніпуляваць грамадзкай думкай. Яны адстойваюць сваё права выказацца.

Айцец Уладыслаў Завальнюк — абвясьціўшы галадоўку.

Тэоляг Пётра Рудкоўскі — заклікаўшы вернікаў байкатаваць прагляды фільму «Код да Вінчы».

Журналіст Аляксандар Фядута — абгрунтоўваючы шкоднасьць палітычных правакацыяў, зьвязаных з пытаньнямі веры.

Журналіст Віталь Тарас працуе ў іншым жанры. Ён правакуе атаку на тых, з кім нязгодны. Стасоўна мяне ён робіць гэта не ўпершыню, прычым шторазу сьвядома прыпісваючы мне тое, чаго я не казаў, не пісаў, і нават ня меў наўвеце. Для даведкі прашу рэдакцыю «НН» разьмясьціць у газэце адрас публікацыі, на гэты раз таксама велікадушна працытаванай сп.Тарасам:

http://www.nmnby.org/pub/200206/shift.html.

**Аляксандар Фядута**

## УДАКЛАДНЕНЬНЕ

**Mea culpa**

У артыкуле «Гонар апэратара БТ» (№18 за 19 траўня) дапушчаная памылка: у суд 15 траўня не зьявіўся пазоўнік Дзяніс Бальшакоў, а не адказчыца Алеся Сіўчыкава. Аўтар шчыра перапрашае спн.Алесю.

**АШ**

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас:**
**а/с 537, 220050 Менск.**
**e-mail:**
**nn@promedia.by.**
**Факс: (017) 284-73-29.**

# Пушкін incognitus

Як расейскія літаратуразнаўцы ачышчалі Пушкіна ад замежных уплываў.

З гледзішча агульнага патасу апублікаваны ў мінулым нумары «НН» артыкул Аляксандра Фядуты «Танк incognitus» («НН», №18) варты толькі ўхвалы. Аднак варта з засьцярогай паставіцца да прывядзеньня аўтарам у якасьці станоўчага прыкладу гісторыі пушкіністыкі ў СССР у 1950—1970-я г. мінулага стагодзьдзя.

Дык вось: я таксама трошкі знаёмы з гісторыяй. У артыкуле Фядуты няправільна паказана разьвіцьцё пушкіназнаўства.

З артыкулу «Танк incognitus» вынікае, што ў СССР у 1950—1970-я г. камэнтаваньне твораў расейскіх клясыкаў заваёўвала адну вяршыню за другой. Аўтар піша, што пасьля завяршэньня выданьня Вялікага акадэмічнага поўнага збору твораў Пушкіна пачалі выходзіць адмысловыя пушкіністычныя выданьні, Пушкінская камісія Акадэміі навук займалася «вяртаньнем страчанага» — камэнтаваньнем клясыка, у 1970-я Інстытут расейскай літаратуры АН СССР распрацаваў выразна лепшую схему выданьняў поўных збораў твораў расейскіх клясыкаў...

Праўду кажучы, у 1974—1978 г. у СССР выйшла чарговае выданьне ПЗТ Пушкіна. Зь іншага боку, сэрыйныя пушкіназнаўчыя выданьні існавалі задоўга да 1950-х г. Цікава тое, што не ва ўсіх разох выдаўцы Пушкіна 1970-х гг. імкнуліся належным чынам адкамэнтаваць творы свайго героя; у некаторых выпадках, наадварот, яны схавалі раней адкрытыя ісьціны.

Ідзецца найперш пра замежныя ўплывы на Пушкіна і пра так званыя «плягіяты» паэта.

Напрыклад, з камэнтароў у другім выданьні «Твораў» паэта 1938 г. да вершу «Паклёпнікам Расеі» можна было даведацца, што ў гэтым выпадку паэт далучыўся да афіцыёзнага гледзішча. Аляксандар Тургенеў лічыў погляды Пушкіна, выказаныя ў гэтым вершы, «барбарскімі», а Вяземскі называў верш «Паклёпнікам…» «шынельным», г.зн. лакейскім.

З нагоды паэмы «Руслан і Людміла» ў камэнтарох сьцьвярджалася, што яна мае «яскравыя адбіткі ўплыву» замежных фантастычных паэмаў, у першую чаргу «Арлеанскай нявіньніцы» Вальтэра, італьянскіх паэмаў Тасо і Арыёста.

У камэнтары з нагоды «Братоў-разбойнікаў» прыводзілася сьведчаньне самога паэта пра тое, што некаторыя вершы гэтага твору нагадваюць пераклад «Шыльёнскага вязьня» Байрана. Пушкін пакутаваў з гэтай нагоды і прызнаваўся: «Гэта няшчасьце для мяне».

«Бахчысарайскі фантан» — таксама ў пэўнай ступені пераймальніцкі твор, умоўная ўсходняя абстаноўка гарэму ў ім «запазычаная з усходніх паэмаў Байрана». «Граф Нулін» напісаны ў духу байранаўскай жартоўнай паэмы «Бэпа».

З пушкіназнаўчай літаратуры вядома, што ў перадсьмяротнай элегіі Ленскага ня толькі скамбінаваныя стылістычныя элемэнты некаторых францускіх і расейскіх элегіяў, але і ёсьць цалкам запазычаныя радкі: «Куда, куда вы удалились» (зь Перавозчыкава), «Весны моей златые дни» (зь Мілонава). Неарыгінальныя ў Пушкіна выразы «брат по музе», «славы блеск», «бешенство желаний», «служенье муз» — іх да яго ўжывалі Баратынскі, Бацюшкаў, Давыдаў, Жукоўскі.

Але найбольшыя сюрпрызы чакаюць чытача з нагоды гісторыі стварэньня аповесьці «Капітанская дачка». Тут на Пушкіна ўплываў В.Скот (на гэта зьвяртаў увагу ўжо Бялінскі, які сьцьвярджаў, што вобраз Савеліча быў навеяны расейскаму пісьменьніку вобразам Калеба зь «Лямэрмурскай нявесты» В.Скота). Яшчэ больш катэгарычна выказваліся з гэтай нагоды пазьнейшыя дасьледчыкі. Паглыбленыя дасьледаваньні, аднак, паказалі, што яшчэ больш шчодра Пушкін чэрпаў з «Мэмуараў графа Грамона» францускага аўтара Антуана Гамільтона. Савеліч, як сьцьвярджалі дасьледчыкі, быў надзелены цэлым шэрагам рысаў, уласьцівых Брынону з твору Гамільтона. Апісаная ў творы славутая (і, заўважым, некароткая) сытуацыя ў карчме «здаецца проста перанесенай Пушкіным у расейскі быт з заменай ліёнскай карчмы сімбірскай». У дадатак разьвіцьцё дзеяньня ў пушкінскай аповесьці неаднойчы супадае сваімі этапамі з разьвіцьцём дзеяньня ў рамане Віктора Гюго «Бюг Жаргаль».

Выглядае на тое, што Пушкін у некаторых сваіх — этапных для расейскай літаратуры — творах выступаў як таленавіты кампілятар матываў, тэмаў і сюжэтаў, запазычаных ім з заходнеэўрапейскай літаратуры.

Фактычна нешматлікія сьляды гэтай немалаважнай для разуменьня фэномэну Пушкіна тэмы можна знайсьці ў камэнтарох ПЗТ расейскага клясыка 1970-х г.

У камэнтары да паэмы «Руслан і Людміла» згадваецца, што Арміда — гэта чараўніца з паэмы Тасо «Вызвалены Ерусалім», але ў цэлым усяляк падкрэсьліваюцца расейскія крыніцы твору. З нагоды паэмы «Бахчысарайскі фантан» паведамляецца прызнаньне самога Пушкіна пра тое, што гэты твор «адгукаецца чытаньнем Байрана», і сьцьвярджаецца, што шэраг (несумненна, другарадных) дэталяў у апісаньні ўсходняга быту Пушкін запазычыў з «Абідоскай нявесты» Байрана. Да перадсьмяротнай элегіі Ленскага дадзены камэнтар пра тое, што ў ёй злучаны (ня больш як) «характэрныя матывы» рамантычнай элегіі 1820-х. А вось «Браты-разбойнікі» і «Капітанская дачка», паводле камэнтатараў 1970-х г., — гэта цалкам арыгінальныя творы, якія вырасьлі выключна з расейскай рэчаіснасьці. З камэнтароў да вершу «Паклёпнікам Расеі» была зьнята крытыка некаторымі сучаснікамі гэтага вершу. Гэты ваяўнічы твор, у якім асуджаўся «кичливый лях» і згадваліся «волнения Литвы», стаў, такім чынам, «бездакорным». Абазначаная Пушкіным пэрспэктыва «слияния славянских ручьев в русском море» была занадта прывабнай, каб тут было варта згадваць нейкі нэгатыўны гістарычны кантэкст...

І гэта быў значны крок назад у параўнаньні з ранейшымі пушкіністычнымі дасьледаваньнямі.

Пытаньне камэнтаваньня выданьняў спадчыны ў Беларусі стаіць цяпер надзвычай востра — у тым ліку таму, што яно нярэдка выконваецца абы-як. Я ўдзячны Аляксандру Фядуту за магчымасьць выказаць нейкія «заўвагі на палях» з гэтай нагоды.

**Сяргей Каруза, Менск**

# Нашчадкі Лубянкі

Нашто ім партыя, калі ў іх такое КГБ? Піша **Віталь Тарас.**

*«Статуя Дзяржынскага, усталяваная каля Вайсковай акадэміі ў Менску — дакладная копія помніка, які да 1991 году стаяў на Лубянскай плошчы ў Маскве».*

З газэт

На шляху ў савецкае мінулае нельга абысьці КПСС. Праўда, аднаўленьне яе ў Беларусі калі й магчымае, дык, напэўна, у карыкатурным выглядзе. Але хіба апошнім часам нашае жыцьцё не нагадвае суцэльную карыкатуру?

## «Хай жыве КПСС...»

У 1980-я гады Камуністычная партыя Савецкага Саюзу ўжо нічым не нагадвала партыю бальшавікоў, паколькі амаль усе верныя ленінцы былі зьнішчаныя за паўстагодзьдзя да гэтага. Леанід Брэжнеў хоць і карыстаўся пэўнымі сымпатыямі насельніцтва, на ролю правадыра мала падыходзіў — прынамсі, за анэкдоты пра яго, у адрозьненьне ад анэкдотаў пра Сталіна, не саджалі. Як толькі нязгодных з генэральнай лініяй партыі перасталі расстрэльваць, яна перастала быць партыяй аднадумцаў.

«Паноўная кляса»? (Так характарызаваў камуністаў Джылас.) Хутчэй, карпарацыя, прывілеямі ў якой карысталася вяршынька партапаратчыкаў, а нізы заставаліся рабамі, як і большасьць астатняга насельніцтва. Праўда, у шараговых партыйцаў быў шанец выбіцца наверх. Але калі арганізацыя налічвае мільёны...

У гады перастройкі нехта дасьціпна параўнаў пастановы і іншыя дакумэнты ЦК КПСС з каштоўнымі паперамі. У адсутнасьць сапраўднага рынку гэтыя паперы служылі сваеасаблівымі індыкатарамі для актараў тагачаснай эканомікі: як будуць разьмяркоўвацца фінансавыя патокі, у якую галіну будуць укладацца грошы, якія тавары будуць дэфіцытнымі і г.д.

Няма нічога дзіўнага ў тым, што менавіта з шэрагаў партыйных кіраўнікоў, а таксама камсамольскіх важакоў у 1990-я гады сфармавалася новая паноўная кляса ў Расеі ды іншых краінах былога СССР.

У гады перабудова высьветлілася, што на самым версе КПСС былі людзі з зусім рознымі поглядамі. З аднаго боку, напрыклад, Гарбачоў і Якаўлеў, з другога — Лігачоў, Лук'янаў, Кручкоў. Так што ні аб якім «маналітным адзінстве» ўнутры партыі не было й размовы. А тым больш — аб адзінстве партыі і народу.

Яшчэ ў 1960-я гады, напрыклад, нарадзілася вершаваная карацелька: «Мы Амэрыку нагонім па надоях малака, і па мясе мы нагналі б — ... зламаўся ў быка». Анэкдотаў пра партыю і яе правадыроў можна ўспомніць безьліч. А вяршыняй, дакладней — бліскучым фінальным акордам народнага фальклёру на гэтую тэму засталася фраза, якая нарадзілася ў красавіку 1986-га году: «Хай жыве КПСС на Чарнобыльскай АЭС!» Гэта быў прысуд камуністычнай сыстэме.

I хаця пасьля спробы путчу ў жніўні 1991 году на барыкады ў Маскве выйшла зусім няшмат людзей (у іншых сталіцах саюзных рэспублік пратэсты былі яшчэ менш маштабныя), бараніць КПСС, зьліквідаваную Ельцыным адным росчыркам пяра, ня выйшаў ніхто. Найбольш разумныя і дальнабачныя пачалі выходзіць з партыі й публічна паліць свае партбілеты яшчэ перад гэтым.

## «Делать жизнь с кого? С товарища Дзержинского!»

I вось, амаль праз пятнаццаць гадоў пасьля таго, як на Лубянскай плошчы, побач з будынкам КГБ СССР, супрацоўнікі якога тады перабывалі ў шоку, быў дэмантаваны помнік Дзяржынскаму, копія гэтага помніка ўсталёўваецца ў Менску. Разам з помнікам «жалезнаму Фэліксу» на ягонай радзіме ў Дзяржынаве, а таксама бюстам у сквэры насупраць КГБ у сталіцы — гэта ўжо трэці помнік у Беларусі заснавальніку ЧК.

Тое, за што апошнія дзесяць гадоў змагаліся расейскія камуністы, ўдалося ажыцьцявіць не ў Маскве, але ў Менску. Магчыма, паміж словамі кіраўніка Беларусі аб тым, што ён ня супраць стварэньня партыі кшталту КПСС, і адкрыцьцём чарговага помніка Дзяржынскаму, якое адбылося ўсяго праз колькі дзён, няма непасрэднай сувязі. Пасьля таго — ня значыць у выніку таго. Але ж таксама як зруйнаваньне «жалезнага Фэлікса» зрабілася знакам жнівеньскай рэвалюцыі (дарэчы, адзіным рэальным яе здабыткам), гэтак і ягонае аднаўленьне ці, так бы мовіць, матэрыялізацыя ў новай гістарычнай рэчаіснасьці ёсьць знакам вяртаньня ў савецкае мінулае.

Лукашэнка ў сваім пасланьні ня проста ўпершыню дапусьціў магчымасьць стварэньня

Працяг на старонцы 22.



Праблема выбараў у будучыні зьнікае сама сабой. Абірае партыя, паводле прынцыпу «дэмакратычнага цэнтралізму».




**Старшыня КДБ Сьцяпан Сухарэнка (у цывільным) і камандуючы памежнымі войскамі Аляксандар Паўлоўскі разам адкрывалі новы помнік Дзяржынскаму.**

# Нашчадкі Лубянкі

**Працяг са старонкі 20.**

прыўладнай партыі. Згадаўшы КПСС, ён адназначна даў зразумець, якой павінна быць гэтая партыя. І акрамя таго, дакладна ўказаў, якім шляхам павінна яна ствараца — паводле ініцыятывы зьнізу. Той, хто мае вушы, той пачуе: зьнізу — гэта значыць з дапамогай Фэдэрацыі прафсаюзаў і БРСМ. Адтуль мусіць зыходзіць «народная ініцыятыва». Акрамя таго, ёсьць жа яшчэ ўсебеларускі сход.

Адкрыцьцё помніка Дзяржынскаму сталася свайго роду індыкатарам, праверкай слыху. Сыгнал зьверху быў пачуты і зразуметы адэкватна. Ўлады рапартуюць свайму вышэйшаму кіраўніку: рэстаўрацыя савецкай сыстэмы, аб якой увесь час гаварылі, у Беларусі завершаная.

Зразумела, звычка рапартаваць аб тым, што зададзеньне начальства выканана і перавыканана датэрмінова, таксама засталася з савецкага часу. Як заўсёды перад здачай аб'екту ў эксплюатацыю, ёсьць пакуль «асобныя недаробкі». Ня ясна, напрыклад, як будзе называцца партыя «новага тыпу» і на якой ідэалёгіі ўсё-ткі яна будзе базавацца?

## Альбанская мадэль

Наўрад ці яна будзе называцца камуністычнай.

Здавалася б, самае простае — узяць КПБ ды надаць ёй ролю «паноўнай». Але кіраўнік дзяржавы не выпадкова згадаў у сваёй прамове КПСС, а не КПБ. Па-першае, Кампартыя Беларусі (у адрозьненьне, скажам, ад Кампартыі Ўкраіны, у якой заўсёды былі моцныя незалежніцкія тэндэнцыі і дзе нават было не Бюро ЦК, а Палітбюро) ніколі самастойнай ролі не адыгрывала. Да таго ж, імя адзінага вядомага і папулярнага ў народзе лідэра КПБ — Пятра Машэрава — ужо даволі даўно выклікае ў кіраўніка Беларусі няпрыязь. Год таму адбылося перайменаваньне праспэкту Машэрава ў праспэкт Пераможцаў (больш правільна, напэўна, было б казаць — Пераможцы?).

Акрамя таго, ёсьць жа яшчэ Партыя камуністаў Беларуская. Што зь ёй рабіць? Зьнішчыць? А як на гэта глядзецьмуць таварышы з КПРФ, іншых братніх кампартыяў?

Не, размова вядзецца, хутчэй за ўсё, менавіта пра КПСС. Іншымі словамі — пра адбудову мадэлі Савецкага Саюзу ў маштабах адной, асобна ўзятай дзяржавы. Ня важна, што аб'яднаньне Беларусі й Расеі ў адзіную дзяржаву — тым больш на раўнапраўнай падставе — сёньня выглядае праблематычна. У Беларусі, як сказаў яе кіраўнік, ёсьць уласная годнасьць. Выступ яго перад нацыянальным сходам вельмі нагадваў па сваім патасе выступ Пуціна. Абодва кіраўнікі сягалі ў сваіх прамовах глябальных маштабаў — так, быццам за імі стаяць рэсурсы й ваенная магутнасьць Савецкага Саюзу. Кіраўнік Беларусі як бы ўнутрана спаборнічаў са сваім расейскім калегам у праве на лідэрства. Прычым, як казаў Чапаеў у аднайменным фільме, у сусьветным маштабе.

Гэтак Кітай (нездарма Лукашэнка згадваў яго ў сваёй прамове ў якасьці прыярытэту замежнай палітыкі), Румынія, Югаславія і нават маленькая Альбанія некалі спаборнічалі з Савецкім Саюзам у праве лічыцца адзінай сапраўднай камуністычнай дзяржавай.

Яшчэ ня так даўно Беларусь параўноўвалі зь Югаславіяй пэрыяду «народнага сацыялізму». Цяпер, калі ад Югаславіі не засталося ўжо нічога, а Беларусь прасунулася далёка назад у параўнаньні зь ёй у справе дэмакратыі, альбанская мадэль другой паловы XX стагодзьдзя выглядае найбольш годнай пераймання. Для яе былі характэрныя апора на ўласныя сілы, поўная ізаляцыя на міжнароднай арэне, ператварэньне краіны ў суцэльную вайсковую крэпасьць. І пры гэтым — крайні нацыяналізм і, вядома ж, культ правадыра партыі й народу.

## КПСС ці КГБ?

Дарма аналітыкі кажуць пра стварэньне нейкай паноўнай партыі ці партыі ўлады, накшталт «Адзінай Расеі». Лукашэнка ніколі гэтай ідэі не падтрымліваў і не падтрымае. Стварэньне «партыі ўлады» мае на ўвазе існаваньне і некалькіх іншых партыяў — хай сабе дзеля дэкарацыі, як гэта было ў так званых краінах народнай дэмакратыі ва Ўсходняй Эўропе. КПСС, паводле Канстытуцыі СССР, была «адзінай і накіроўваючай сілай» савецкага грамадзтва. (Адмена шостага пункту Канстытуцыі, які надаваў партыі бязьмежныя правы, азначала ў выніку крах камуністычнай сыстэмы.) А больш — аніякіх партыяў. Генэральны сакратар ЦК КПСС аўтаматычна станавіўся кіраўніком дзяржавы, незалежна ад таго, як гучала яго дзяржаўная пасада — старшыня Савету міністраў ці старшыня Прэзыдыюму Вярхоўнага Савету.

Няцяжка здагадацца, што менавіта гэты элемэнт падаўся найбольш прывабным цяперашняму кіраўніку Беларусі. Праблема выбараў у будучыні зьнікае сама сабой. Абірае партыя, паводле прынцыпу «дэмакратычнага цэнтралізму». На ўсеагульных выбарах народу даецца права зацьвердзіць адзінага кандыдата ад блёку партыйцаў і беспартыйных...

І ўсё-ткі, у кіраўніка дзяржавы яшчэ застаюцца сумненьні. А што, калі большасьць насельніцтва маўкліва збайкатуе «ініцыятыву зьнізу» і не паваліць валам у новую партыю? Можна, вядома, загнаць у яе людзей пад прымусам, як у БРСМ. Але што гэта будзе за партыя і навошта яна ў такім выпадку патрэбная? Лепей ужо заставацца народным прэзыдэнтам.

А яшчэ можна абысьціся й бяз партыі, сіламі аднаго толькі КГБ. Геніяльна і проста. А ў якасьці сымбалю гэтай новай дзяржаўнай пабудовы нічога лепшага не прыдумаць, як постаць «суайчынніка» беларусаў Фэлікса Дзяржынскага.

Але ж гістарычнае месца для яго ўсё адно застаецца на Лубянскай плошчы ў Маскве. У Менску ёсьць месца для іншых помнікаў, і галоўнае сярод іх — плошча Каліноўскага.

# Атрымаць крэдыт і нічога ня страціць

Некалькі месяцаў таму Нацбанк прыняў распараджэньне, якое забараняе банкам улучаць у плату за крэдыт іншыя камісіі, акрамя працэнтавай стаўкі.

Галоўная праблема сфэры крэдытаваньня — зарплата «ў канвэрце». Прыватныя бізнэсоўцы адмаўляюцца сплачваць высокія падаткі — каля 60% ад заробку. Банкам гэта добра вядома (а часам знаёма), таму разьлічваецца крэдыт пры ўмовах пагашэньня штомесячна сумы пазыкі, роўнай 50% заробку (нават калі вы зарабляеце 300 тыс. на ўсю сям'ю).

Банкам гэта выгадна, і было б нявыгадна адваротнае. Напрыклад, калі банк дае патрэбныя грошы на год, а карыстальнік сплачвае пазыку цягам трох, банк губляе свой прыбытак на адсотках. Пра тое, што гэтая зьява ня надта ўжо рэдкая, сьведчаць уведзеныя некаторымі банкамі ўмовы па тэрмінах пагашэньня крэдыту. Напрыклад, Белгазпрамбанк уводзіў штрафныя санкцыі (6% ад атрыманай суммы), калі крэдыт пагашаўся на 6 месяцаў раней.

Гатовых купляць у крэдыт шматкроць болей, чым плацежаздатных паводле дакумэнтаў. З гэтай прычыны цяжка знайсьці і паручніка. Прыватныя банкі больш чулыя да патрэбаў рынку, таму некаторыя спрашчаюць патрабаваньні фактычна да адной даведкі, якую лёгка зрабіць. «Зь дзяржаўнымі банкамі працаваць немагчыма, — абураецца Ўладзімер Кандруцкі, супрацоўнік аўтапарку пры ўваходзе ў камэрцыйны банк. — Я браў крэдыт у «Беларусбанку» — гэта ж якая цяганіна! Назьбіраць стос паперак, прывесьці паручніка з адпаведнымі прыбыткамі. Дзе ты іх сёньня знойдзеш? А тут прынёс даведку пра свой заробак за апошнія тры месяцы — і ўсё».

Праўда, за такі давер ахвотнікам даводзіцца плаціць вышэйшымі адсоткамі і іншымі камісійнымі. Нягледзячы на тое, супрацоўнікі прыватных банкаў адзначаюць, што попыт на такія паслугі ўпэўнена ідзе ўгару. «У галоўным упраўленьні мы абслугоўваем прыкладна сотню кліентаў за дзень, — паведаміла «НН» кіраўнічка аддзелу работы зь фізычнымі асобамі аднаго з такіх банкаў. — За красавік наш банк выдаў больш за 6 тыс. крэдытаў».

Які б «галаўны боль» не прыносілі схаваныя ад падаткаў грошы для спажыўцоў і бізнэсоўцаў, для дзяржавы гэта цяжкая хвароба, якой часткова пазбываюцца праз тыя самыя крэдыты. Распараджэньне Нацбанку палепшыла ўмовы крэдытаваньня, хоць шэраг банкаў замаскавалі свае «накручкі» пад завышаным фіксаваным тарыфам за абслугу. Грашова-крэдытная палітыка дзяржавы накіраваная на выманьне наяўных грошай з абарачэньня. Акрамя плястыкавых картак з банкаматамі, крэдытаваньне — вельмі зручны інструмэнт. Адсачыць, куды пайшлі наяўныя грошы за тавар альбо ці былі сплочаныя зь іх падаткі, амаль немагчыма, крэдытныя — справа некалькіх хвіляў.

Умовы ў гэтай сфэры маюць доўгатэрміновую тэндэнцыю паляпшацца, але ж, круці ні круці, за наяўныя любую рэч можна купіць таньней на 18%.

**Тацяна Гацура**



PHOTO.BYMEDIA.NET

### Гісторыя аднаго набытку

Тры месяцы таму мой знаёмы вырашыў набыць кампутар. Спыніўся на мадэлі за 1000 даляраў. Але калі выявілася, што заводадаць ім ён жадае праз крэдыт, да гэтай сумы дадалі 18% (НДС). Крэдыт афармілі на 90% — 2 400 000 рублёў пад 14% гадавых, роўным 265 000 рублёў за ўвесь час карыстаньня (18 мес.). Акрамя гэтай узнагароды, паводле дамовы з банкам, была прадугледжана яшчэ адна камісія ў памеры 1,5% штомесяц зь першапачатковай сумы крэдыту, роўная 650 000 рублёў за ўвесь час карыстаньня.

Урэшце за крэдыт яму давядзецца заплаціць:

2 400 000 (фактычная сума) + 265 000 (адсоткі) + 650 000 (камісійныя) + 200 000 (першапачатковы ўнёсак) = 3 515 000.

У эквіваленце гэта сума роўная $1635, а значыць, на 38% даражэй за набыцьцё наяўнымі.

Як кажуць, факты гавораць самі за сябе.

# Н А В І Н Ы   Э Ў Р А З Ь В Я З У

## «І пасьля вызваленьня — Беларусь»

Дзейная структура Эўразьвязу разьлічаная ня больш чым на 27 краінаў-сяброў. Аб гэтым заявіў эўракамісар у пытаньнях пашырэньня Олі Рэн: «Пасьля далучэньня Баўгарыі й Румыніі трэба будзе распрацоўваць сыстэму ўлады, каб працэс пашырэньня мог працягнуцца». Разам з тым эўрачыноўнік падкрэсьліў, што ня варта адмаўляцца ад стратэгіі, скіраванай на далейшае пашырэньне ЭЗ, а таксама на ўзмацненьне эўрапейскай палітыкі суседзтва, «асабліва для такіх краінаў, як Украіна, Малдова й, пасьля свайго вызваленьня, Беларусь».

## Вадарод замест бэнзіну

У хуткім часе на вуліцах эўрапейскіх гарадоў зьявяцца 200 новых аўтобусаў на вадародным паліве. Эўракамісар у энэргетычных пытаньнях Андрыс Пібальгс з гэтай нагоды падкрэсьліў, што пытаньне ня ў тым, ці здольная працаваць гэтая тэхналёгія, а ў тым, калі яна стане канкурэнтаздольная. Аўтобусы будуць рухацца з дапамогай адмысловых электрахімічных прыстасаваньняў, што будуць выпрацоўваць электраэнэргію для рухавікоў, мяшаючы кісларод з паветра й вадарод, ня робячы аніводнага выхлапу. Для іх абслугоўваньня пабудавана некалькі дзясяткаў адмысловых вадародных запраўак.

## Беларусь — у новай праграме

Намесьнік кіраўніка Прадстаўніцтва Эўракамісіі ва Ўкраіне й Беларусі Дырк Шубэль, выступаючы на імпрэзе, зьвязанай з адкрыцьцём Дзён Эўропы ў Менску, адзначыў, што «Беларусь яшчэ не заняла належнае ёй па праве месца ў сям’і эўрапейскіх народаў, больш за тое, палітычная сыстэма Беларусі яшчэ больш аддалілася ад эўрапейскіх дэмакратычных нормаў і каштоўнасьцяў».

Ён таксама падкрэсьліў, што Эўракамісія — адзін з найбуйнейшых донараў у Беларусі. Былі агучаныя лічбы: з 1991 па 2004 гады агульны аб’ём дапамогі Беларусі ад Эўразьвязу склаў 221 млн эўра, а разам зь мінулым і гэтым гадамі лічба павялічыцца яшчэ на 10 млн. Цяпер галоўнае фінансаваньне ажыцьцяўляецца праз праграму TACIS, асноўнымі мэтамі якой ёсьць падтрымка эфэктыўнага кіраваньня, устойлівага разьвіцьця, сацыяльнай сфэры, аховы здароўя, экалёгіі й эканамічнага разьвіцьця. Сп.Шубэль нагадаў, што з наступнага году праграма TACIS будзе замененая новай праграмай — «Эўрапейскае суседзтва й партнэрства».

## Гары Потэр і Эўрапейская Канстытуцыя

Віцэ-прэзыдэнт Эўракамісіі Марго Вальстрэм заклікала да шырокага абмеркаваньня Канстытуцыі Эўразьвязу, каб узнавіць пытаньне яе прыняцьця. Паводле яе словаў, галоўная праблема Канстытуцыі — памер (448 артыкулаў з дадаткамі). «Так, гэтую кніжку не прачытаеш перад сном. Цуды нам пакуль не па сілах — Гары Потэр ня сябар Эўракамісіі. Але прыняцьце Канстытуцыі — адзін з галоўных сродкаў разьвіцьця ЭЗ. Гэты праект мае шэраг пераваг, якія нельга згубіць праз часовыя няўдачы пры галасаваньні», — дадала спн.Вальстрэм.

## Гэта новае слова — санкцыі

Эўразьвяз заблякаваў рахункі вышэйшага кіраўніцтва Беларусі на чале з Аляксандрам Лукашэнкам, а таксама асобаў, якія адказныя за парушэньні свабоды слова ў краіне. Гэта ўжо другі этап санкцыяў супраць беларускага вышэйшага чынавенства. Месяц таму краіны ЭЗ, а таксама Канада й ЗША, забаранілі ўезд на свае тэрыторыі прадстаўнікам беларускіх уладаў.

## Шмат мільёнаў неграмадзянаў

«У эўрапейскіх краінах зараз жыве каля 25 мільёнаў людзей, што ня маюць грамадзянства ў краінах сталага пражываньня», — сьцьвярджаецца ў дасьледаваньні, праведзеным эўрапейскім упраўленьнем статыстыкі Эўрастат. Значная большасьць іншаземцаў прыехала з-за межаў ЭЗ. Больш за ўсё неграмадзянаў (у адсоткавым вымярэньні) жыве ў Люксэмбургу (38,6%). На другім і трэцім месцы — адпаведна, Латвія й Эстонія (больш за 20%). У астатніх краінах Эўразьвязу неграмадзянаў ад 5 да 10%. Найменшая колькасьць — у Славаччыне — 0,6%. Разам з тым сярэдні ўзрост «эўрапейскіх неграмадзянаў» увесь час памяншаецца.

## Баўгарыя й Румынія — у чаканьні вэрдыкту

У кастрычніку Эўракамісія распаўсюдзіць справаздачу, вынікам якой стане вэрдыкт па магчымасьці далучэньня названых дзьвюх краінаў да Эўразьвязу ўжо 1 студзеня 2007 году. Нагадаем, гэта можа здарыцца, калі гэтыя краіны выканаюць усе «адаптацыйныя» мерапрыемствы, прычым найперш — нават не ў эканамічнай сфэры. Выступаючы ў Эўрапарлямэнце, прэзыдэнт Эўракамісіі Жазэ Мануэль Барозу пацьвердзіў, што «гэтыя краіны выканалі багата задачаў, што перад імі стаялі. Але гэтага недастаткова: мы патрабуем больш значных зрухаў у галінах юстыцыі й унутраных справаў, у забесьпячэньні правоў меншасьцяў і барацьбы з карупцыяй».

## Асьцярожна, рынкі адкрываюцца

З 1 траўня эўрапейскія краіны адкрылі свае рынкі працоўнай сілы. Гішпанія, Партугалія, Фінляндыя й Грэцыя далучыліся да Брытаніі, Ірляндыі й Швэцыі ды зьнялі абмежаваньні для працоўных з васьмі навадалучаных краінаў Усходняй Эўропы. Францыя, Італія й Люксэмбург маюць адкрыць свае рынкі ў тых галінах, дзе не стае ўласных адмыслоўцаў, а Бэльгія й Нідэрлянды разгледзяць гэтае пытаньне да канца бягучага году. Што да Нямеччыны й Аўстрыі, то яны працягнуць дзеяньне абмежаваньняў да 2009 г. Дадамо, што за апошнія два гады звыш паўмільёна грамадзянаў «новых» краінаў Эўрапейскага Зьвязу накіраваліся па працу на Захад. Большасьць такіх працоўных — з Польшчы.

**Зьміцер Дрыгайла**

**Падрыхтавана пры падтрымцы Прадстаўніцтва Эўрапейскай камісіі ва Ўкраіне і Беларусі**
**http://www.delblr.cec.eu.int**

# «Гудбай, бацька»




Сьмеючыся, мы разьвітваемся з сваёй цяпершчынай. **Андрэй Расінскі** — пра новую прадукцыю «Навінак».

26 траўня на сядзібе БНФ творчая група «Навінак» наладзіла прэм’еру трэшавага відэакоміксу «Гудбай, бацька!». Фільм пастаўлены паводле нямецкай стужкі «Гудбай, Ленін!», але дзеяньне скарэктаванае з улікам нашых рэалій.

Бацька Каляна, фаната тэленавінаў, вылучаны дэлегатам на трэці ўсебеларускі народны сход. Пасьля таго як сам прэзыдэнт пацісную яму руку, продак збрэндзіў ад шчасьця і ўпаў у посталькагольную кому. Але сапраўдныя праблемы пачаліся, калі зацяты лукашыст ачуняў пасьля выбараў — ужо ў новай, дэмакратычнай краіне. Любое душэўнае хваляваньне можа скончыцца для небаракі летальным запоем. І таму Калян сам мантажуе навіны — і ствараe «стабільную квітнеючую Беларусь» у асобна ўзятай кватэры.

Цудоўны эфэкт мантажу стаўся ўдарнаю фішкай «Навінак». Лукашэнка адкрывае казіно ў будынку Нацыянальнай бібліятэкі, на тэлеканале «Лад» ідзе эратычнае шоў, а сьвята «Дажынак» у Бабруйску падазрона нагадвае нямецкі гей-прайд.

Дыктары гавораць аб продажы Трактарнага заводу, а на вуліцах адбываюцца сутычкі работнікаў МАЗу зь беларускай паліцыяй.

Бурлескны мантаж агаляе нішчымнасьць афіцыёзнай хлусьні — але таксама камічнасьць лібэральных летуценьняў — і прымушае вішчаць ад сьмеху. Рэальнасьць — як фікцыя, створаная мэдыямі. Менавіта яны галоўныя героі стужкі (нізкі паклон БТ і АНТ).

Для прававерных бабулек, якія «бачаць усё сваімі вачыма па тэлевізары», карціна будзе цяжкой псыхічнаю траўмай (а далейшае лекаваньне «Панарамамі» гарантуе шпіталізацыю). Але «аптымістычная фантазія» перасьцерагае й прыхільнікаў дэмакратыі — ад празьмернае эйфарыі.

Акторская гульня — дакладней, яе адсутнасьць — слабое месца карціны. «У нас і ня будзе прафэсійных актораў, — кажа Паўлюк Канавальчык, які стаўся рэжысэрам, — у нас тыпажы». Але ня ўсе тыпажы пасуюць па сваім веку і выглядзе.

Тым ня менш «Навінкі» засьведчылі калясальны творчы — адылі й камэрцыйны — патэнцыял. Пасьля «Случая з пацаном» узровень іхняга кіно заўважна вырас. А некалькі кадраў з прыдуманых тэлевізій заінтрыгавалі нахабствам амбіцый: канал «Навінкі хорар», «Sexy Навінкі», «Cartoon Навінкі» (галоўны герой — чырвона-зялёны вусаты супэрмэн). А «Arthouse Навінкі» — «Гарэлка і цыгарэты» — прысьцёбка з Джыма Джармуша.

«Увосень мы плянуем выпусьціць хорар «Толькі мёртвыя анічога не баяцца», — падзяліўся Паўлюк Канавальчык новымі творчымі плянамі, — кадры зь яго вы ўжо бачылі». А чырвона-зялёны «Супэрбацька» быў героем часопісу, што так і ня выйшаў у сьвет.

Сам навінкаўскі фільм вырастаў з фатакоміксаў, якімі славілася газэта. Калі выданьне забаранілі, коміксы перайшлі ў Сеціва, а потым раскадраваліся і ў кіно.

«Мы натхняліся нашай сацыяльна-псыхіятрычнай рэчаіснасьцю», — кажа рэжысэр аб крыніцах натхненьня.

26-хвілінны фільм ствараўся з 5 сакавіка — два месяцы. Змантажаваны на хатнім кампутары, распаўсюджваецца на кампутарных плытках.

Піратства вітаецца, але можна й набыць стужку. «Мы яшчэ DVD-вэрсію выпусьцім, з бонусамі!»

«Гопнікам з Паўднёвага Захаду фільм спадабаецца, — з задавальненьнем адзначыў адзін з гледачоў, — я сам падкіну ім копію».

Заля, што была забітая да адказу, выбухала рогатам не аднойчы. «Гудбай, бацька, гудбай!» Сьмеючыся, мы разьвіталіся з сваёй цяпершчынай.




**Тэлерэчаіснасьць, створаная галоўным героем фільму: абвяшчэньне бел-чырвона-белага сьцяга «Штандарам Перамогі» з нагоды 594-годзьдзя Грунвальду.**

# «Хэ-хэ-хэ»

Выстава Руслана Вашкевіча ў Музэі сучаснага мастацтва.




25 траўня ў Музэі сучаснага выяўленчага мастацтва (пр. Скарыны, 47; мэтро «Плошча Якуба Коласа»), адбылася прэзэнтацыя «ХЭ» — новага праекту славутага мастака Руслана Вашкевіча. Гэта самы вядомы прадстаўнік сучаснага беларускага авангарду. Руслан Вашкевіч — мастак з інтэлектуальна-іранічай інтуіцыяй.

Ягоны праект «ХЭ» прэтэндуе на адкрыцьцё новага віду выяўленчага мастацтва. Сутнасьць «ХЭ» палягае на «жывапісных лінейных іміджах», што нагадваюць і дратовыя карункі, і малюнкі вугалем. Але перадусім гэта жывапіс. Жывапіс, да суаўтарства ў якім запрашаюцца й гледачы, бо колер ня ўласнасьць адно аўтара. Колеры належаць усім.

Зрэшты, і без таго гледачам сумна на выставе ня будзе. Вось бязьмежна шчасьлівы музыка без нагі, які грае нешта, зразумелае адно ягонай глуханямой прыяцельцы («Аднаногі бандыт»), а вось адрэзаная галава, якая ляжыць на кнізе, пэўна, захапляльнае чытанкі, і прагна сьсе цыцку («Юдыф»), штучнае дыханьне і спакусьліва прыўзьнятая спадніца («Зьнесеныя ветрам»). А хіба ж ня тое самае жаданьне зьяўляецца вытокам памкненьняў Руслана Вашкевіча, калі ён зь нястомнай руплівасьцю стварае вобразы жаночай прыгажосьці і непаўторнасьці, што вызначаюць сутнасьць жанчыны? Такім чынам, творы Руслана Вашкевіча — гэта ня толькі мастацкія выявы самі сабою і ня толькі рэалізацыя пэўнай тэмы, але і тое нябачнае, што стаіць за кожным вобразам, кожнай тэмай.

Не занудзіцца глядач. Гэткім культурным героям, як Адам Глёбус і Ўладзімер Колас, то пэўна не было нудна на вясёлым вэрнісажы.

Выстава працягнецца да 10 чэрвеня.

**СХ**



ЮРАСЬ ДЗЯДЗІНКІН

**Вячаслаў Ракіцкі.**

# Беларусь у «свабадзянскіх» апавяданьнях

На прэзэнтацыю кнігі Вячаслава Ракіцкага «Беларуская Атлянтыда» 25 траўня ў Палацы мастацтваў прыйшоў увесь менскі мастацкі сьвет. Апроч традыцыйна франдзёрскіх Акудовіча, Анціпенкі, Арлова быў кіраўнік Саюзу мастакоў Уладзімер Басалыга. Прэзэнтацыя ў цэнтры Менску кнігі, выдадзенай амэрыканскім радыё «Свабода», у нашыя дні выглядае ледзь не эпатажам.

«Беларуская Атлянтыда» — дзясятая кніга ў сэрыі «Бібліятэка Свабоды». У выданьне ўвайшлі тэксты аднайменнай сэрыі перадачаў, якую на «Свабодзе» вядзе мастацтвазнаўца В.Ракіцкі. Пры ілюстрацыі кнігі былі выкарыстаныя геніяльныя афорты Ва-




**Конкурс бодзі-арту падчас фэстывалю авангарднай моды «Мамант-2005» у Менску 26 траўня.**

лер'я Славука, ілюстратара «Шляхціца Завальні».

Цягам апошняга дзесяцігодзьдзя ў андэрграўнд мусіла сысьці практычна ўся беларуская культура: цяпер мацярык беларускай гісторыі адкрываецца толькі праз недзяржаўныя радыё, газэты, часопісы. У андэрграўнд патрапілі ня толькі такія тэмы, як «Маскоўскія нявольнікі ў Магілёве» альбо «Каляніяльнае і незалежніцкае сьветабачаньне», але і зусім нібыта бяскрыўдныя «Смак сыру», «Загадкі й разгадкі сноў», «Выкарыстаньне цьвікоў»... Кіраўнік Беларускай рэдакцыі «Свабоды» Аляксандар Лукашук распавёў, што адна зь менскіх FM-станцыяў вяла перамовы з «Свабодай» пра набыцьцё якіх-кольвечы перадачаў. Лукашук прапанаваў «Беларускую Атлянтыду»: у якасьці прынады назваў тэму «Сэкс і кантрацэпцыя ў Вялікім Княстве Літоўскім». Кіраўніцтва радыёстанцыі зацікавілася, пачаліся перамовы, але... Неўзабаве яны былі спыненыя, галоўны рэдактар FM-станцыі апынуўся ў эміграцыі ў Кіеве, прадусэр таксама разьвітаўся з сваёй пасадай.

Госьці-суаўтары Ракіцкага ўвасаблялі абазначаныя імі тэмы. Філёзаф Акудовіч разважаў пра інтэлектуалаў: «Як у Італіі сорамна ня ўмець сьпяваць, так у Беларусі сёньня сорамна ня быць інтэлектуалам. Каб схаваць свой сорам за адсутнасьць інтэлектуальнасьці, кіраўнік Беларусі будуе бібліятэку. Можаце ўявіць памеры таго сораму паводле памераў бібліятэкі...» Вацлаў Арэшка, рэпрэзэнтаваны ўсім як шляхціч, распавядаў пра спаконвечныя шляхецкія рысы: «Калі я чытаў апісаньні соймікаў, у мяне складалася ўражаньне, што чытаю справаздачы з апазыцыйных нарадаў: там тыя ж Пазьнякі, Статкевічы, Хадыкі...» Фальклярыстка Лія Салавей распавядала пра чарадзейныя ўласьцівасьці птушак ды ролю іх у чалавечым жыцьці. А Сяргей Дубавец, аўтар «Вострай Брамы», павіншаваўшы калегу, адзначыў: «Шмат ёсьць розных беларускіх Атлянтыдаў. Я прыехаў сюды зь Вільні — яшчэ адной беларускай Атлянтыды». І папрасіў у падарунак яшчэ пару асобнікаў кнігі Ракіцкага: маўляў, на зваротным шляху прасілі прыхапіць з сабой беларускія мытнікі...

Скончылася прэзэнтацыя раздачай кніг, але і тут не абышлося безь сюрпрызаў: каб атрымаць падарунак, трэ было адказаць на колькі пытаньняў анкеты. Праверце сябе: у якіх беларускіх вадаёмах вадзіліся цмокі? Хто зь вялікіх назваў пінскае балота морам? Калі ў Беларусі пачалі вырошчваць бульбу (стагодзьдзе і ўладца)? Якімі каленіямі валодала Беларусь у старажытнасьці? І ведаеце, у залі знайшоўся не адзін чалавек, які правільна адказаў на гэтыя ды іншыя пытаньні. Жыве беларуская Атлянтыда!

**Адам Воршыч**



# Гедройц у Менску

Міжнародная канфэрэнцыя «Канцэпцыя УЛБ (Украіна, Літва, Беларусь) — ад ідэі да рэалізацыі», прымеркаваная да 100-годзьдзя з дня нараджэньня Ежы Гедройца, адбудзецца 8—10 чэрвеня ў Менску. Арганізуюць яе Міжнародная асацыяцыя беларусістаў, Польскі інстытут у Менску, Таварыства апекі над архівамі Літаратурнага інстытуту ў Парыжы пры дапамозе польскага пасольства.

Удзел у канфэрэнцыі маюць узяць людзі, якія працавалі ў Літаратурным інстытуце ў Парыжы й рабілі разам з Гедройцам парыскі часопіс «Kultura»: Натальля Гарбанеўская, прафэсар Багдан Асадчук, які наладжваў польска-ўкраінскія кантакты, публіцыст Леапольд Унгер, доктар Марк-Марцін Жаброўскі, прэзыдэнт Таварыства апекі над архівамі Марк Краўчык.

Падчас канфэрэнцыі пойдзе гаворка пра радавод Гедройцаў, Менск пачатку XX ст. — месца нараджэньня Ежы Гедройца, традыцыі ВКЛ у сучасных Беларусі, Літве, Украіне ды інш. У канфэрэнцыі возьмуць удзел шматлікія беларускія інтэлектуалы. Не абышлося бязь ляпсусаў: філёзафа Ігара Бабкова арганізатары памылкова прэзэнтуюць як рэдактара часопісу «ARCHE» — так напісана ў праграмцы канфэрэнцыі.

10 чэрвеня ў касьцёле Сьвятога Роха на Залатой Горцы, дзе хрысьцілі Гедройца, адбудзецца мша памяці «апошняга грамадзяніна Вялікага Княства».

**АВ**

# Трэцяе пакаленьне X

**Людзі X — 3: Апошняя бойка** (X-Men: The Last Stand).

ЗША, 2006, каляровы, 103 хв.

**Жанр:** комікс-фантастыка.

**Адзнака:** 5 (з 10).

Супольнасьць мутантаў пад пагрозаю: распрацаваныя лекі, якія вяртаюць звышлюдзей да нормы. Частка мутантаў вырашае стаць, як усе, а частка — вагаецца. Калі лекі становяцца зброяй, Магнэта (Ян Маккелен) зьбірае армію і распачынае супраць людзей вайну. На ягоным шляху становяцца вучні доктара Ксаўера. Але сытуацыя ўскладняецца ўсёмагутнай Джын (Фамке Янсэн), якая ўваскросла — і абрала бок зла.

Комікс Брэта Рэтнэра эфэктны й дынамічны. Выбухі, катастрофы, бойкі з ільдом і полымем і галоўная фішка — палёт на слынным мосьце «Залатыя вароты». Адзін позірк плюшчыць машыны; мутанты займаюцца зьменамі надвор'я, левітацыяй, тэлепатыяй. Іх так шмат, так што не пасьпяваеш іх і запомніць. Але забаўляльны фільм далёка не павярхоўны, бо за кожным мутантам маячыць прывід Ніцшэ.

Што рабіць чалавеку — стаць канфармістам ці разьвіваць свае якасьці? Скіроўваць іх на дабро ці на зло? Гісторыя мутантаў — гэта гісторыя любой этнічнай ці сацыяльнай меншасьці, якая на спробу асыміляваць сябе адказвае тэрорам. Стваральнікі «Людзей Ікс» прапануюць выйсьце: выхаваньне. Канец фільму ўзорны: калматы мутант робіць даклад у ААН…

# Некаторыя любяць глыбакадумней

**Трышчан ды Іжота** (Tristan + Isolde)

ЗША—Вялікабрытанія—Нямеччына, 2006, каляровы, 125 хв.

**Жанр:** мэлядрама паводле легендаў.

**Адзнака:** 4 (з 10).

Калісьці Максім Багдановіч напісаў ухвальную рэцэнзію на пераказ легендаў пра Трышчана ды Іжоту. Паэт адзначаў цэльнасьць і годную прастату пераказу, што перадае дух эпохі.

Для фільму Кевіна Рэйнальдса такіх слоў у яго не знайшлося б.

Асірацелага Трышчана выхоўвае лорд Марк. Пасьля бойкі з ірляндцамі Трышчана ратуе Іжота. Паміж героямі ўспыхвае каханьне, але Іжота прызначаная каралю Марку…

Стужка Кевіна Рэйнальдса (аўтара «Робіна Гуда») — сучасная мэлядрама, перанесеная ў старажытныя часы. Але сучаснасьць забыла сярэднявечную цнатлівасьць. Таму Рэйнальдсу прыходзіцца ўставаць на катурны: вершы Джона Дона, дэкарацыі а-ля галівудзкая «Троя» і глыбакадумнасьць (пасьля каітусу).

Але некаторым дзяўчатам фільм спадабаецца.

**Андрэй Расінскі**

## КІНО НА DVD

**MASTER RECORDS**

«Пад кайфам» («Stoned»)

Драма, Вялікабрытанія, 2005, рэж. **Стывэн Вулі**.

У ролях: **Леа Грэгары, Дэйвід Морысі.**

Скандальная гісторыя заснавальніка «Ролінг Стоўнз» Браяна Джоўнза...

**Менск, Кісялёва 12, т.: 643-21-08**

## ВАРТА ПАГЛЯДЗЕЦЬ 3–4 ЧЭРВЕНЯ

### Субота, 3 чэрвеня

**БТ, 14.30**

«Маем рэчы».

Беларусь, 2006, аўтар і вядоўца — Алесь Матафонаў.

Тэлевізійная перадача. Гэтым разам — пра літоўскі сыр.

**БТ, 22.20**

«Іншы сьвет».

ЗША—Вялікабрытанія—Нямеччына—Вугоршчына, 2003, рэж. Лен Ўайзман.

Містычны баявік.

Здаўна арыстакраты-вампіры вядуць вайну з пралетарамі-ваўкалакамі. У гэтую вайну ўмешваецца чалавек, у якога закахалася гераіня-вампірка (Кейт Бэкінсэйл).

Анэмічныя пэрсанажы зь ікламі і бязь іх — але атмасфэра, дэкарацыі, касьцюмы і разрыўныя кулі даюць энэргетыкі.

**СТВ, 23.40**

«Правілы каханьня».

Італія, 2000, рэж. Рыкі Таньяцы.

Драма.

Праская вясна 1968 году. Ена Варга калісьці быў хлопчыкам-скрыпачом і марыў пра сустрэчу зь піяністкай Сафі. Гэта адбывалася перад вайною...

Музыку да карціны напісаў Эніё Марыконэ. Кінапрэмія за апэратарскае майстэрства й музыку.

**АНТ, 23.55**

«Скрайнія меры».

ЗША, 1996, рэж. Майк Эптыд.

Трымценьнік паводле раману Майкла Палмэра.

Доктар (Джын Хэкмэн) праводзіць падпольныя мэдычныя экспэрымэнты на людзях. Дзьве ахвяры доследаў уцякаюць і трапляюць да маладога лекара Гая (Г'ю Грант). Гай распачынае няроўную барацьбу за праўду.

### Нядзеля, 4 чэрвеня

**БТ, 19.10**

«Хлусьня, здрада і таму падобнае...».

Францыя, 2004, рэж. Лёран Тырар.

Рамантычная камэдыя.

Рафаэль піша аўтабіяграфіі за знакамітасьцяў. Калі ён складае кнігу пра футбаліста, то даведваецца, што сяброўка гэтага тупіцы — ягонае першае каханьне...

Ролі выконваюць: Эдуар Бауэр («Астэрыкс і Абэлікс: Місія Клеапатра»), Мары-Жазэ Кразэ («Уварваньне барбараў»). Актор Карвіс Карныяк атрымаў за фільм прэмію «Сэзар».

Гран-пры Авіньёнскага кінафэсту за апэратарскую працу (Жыль Анры).

**СТВ, 20.25**

«Дзяўчына на мосьце».

Францыя, 1999, рэж. Патрыс Леконт.

Мэлядрама.

Маладая дзяўчына зьбіраецца кінуцца ў Сену. Немаладому кідальніку нажоў патрэбна асыстэнтка для паказаў. Яны сустрэліся...

Прыз глядацкіх сымпатыяў рэжысэру на фэсьце «Сынэманія», 8 намінацый на прэмію «Сэзар».

Ролі выконваюць: Ванэса Парады, Даніель Атэй (прэмія «Сэзар»).

**БТ, 22.20**

«Белы алеандар».

ЗША—Нямеччына, 2002, рэж. Пітэр Касьмінскі.

Драма паводле дамскага раману Джэнэт Фіч.

Інгрыд атруціла каханка белым алеандрам. Пасьля арышту гераіні яе дачка засталася зусім адна...

Ролі выконваюць: Мішэль Пфайфэр, Рэнэ Зэльвэгер.

**«Лад», 22.30**

«Чорная котка, белы кот».

Францыя—Нямеччына—Югаславія, 1998, рэж. Эмір Кустурыца.

Балканская трагікамэдыя.

Каханьне, сьмех і гратэск — у балканскім вясельлі ад Эміра Кустурыцы.

Кінаклясыка.

«Срэбны леў» за рэжысуру на кінафэсьце ў Вэнэцыі.

**АР**

## ТЭАТРЫ

**Опэра**
*На сцэне Дому афіцэраў*
**2** (пт) — «Трубадур».
**6** (аўт) — «Аіда».
**8** (чц) — «Багема».

**Купалаўскі тэатар**
**2** (пт) — «Вечар».
**3** (сб) — «Сымон-музыка».
**4** (ндз) — «Каханьне ў стылі барока».
**5** (пн) — «Ромул Вялікі».
**7** (ср), **8** (чц) — «Ідылія».
**9** (пт) — «Кім».
**10** (сб) — «Чорная панна Нясьвіжу».
**11** (ндз) — «Памінальная малітва».
*Малая сцэна*
**4** (ндз) — «Адчыніце кантралёру».

**Тэатар юнага гледача**
**2** (пт) — «Сястра мая Русалачка».
**5** (пн) — «Папялушка».
**6** (аўт) — «Парася, якое сьпявае».
**7** (ср) — «Шлях на Бэтлеем».
**8** (чц) — «Жураўліныя пёры».
**9** (пт) — «Каліф-шавец».

**Тэатар беларускай драматургіі**
**5** (пн) — «Чорны квадрат».
**6** (аўт) — «Містэр Розыгрыш».
**7** (ср) — «Шлях у Царград».
**8** (чц) — «Парадоксы жарсьці».

## КАНЦЭРТ

**Адборачны тур «Басовішча»**
**9 чэрвеня** ў парку Dreamland (вул.Арлоўская, 80) пройдзе адборачны тур «Басовішча-2006». Удзел у конкурснай праграме прымаюць маладыя гурты. Сюрпрызам для наведнікаў будуць выступы зорак, імёны якіх арганізатары пакуль не агучваюць. Пачатак а 17-й. Квіткі: дарослы — 13 000, студэнцкі, школьны — 12 000, групавы (група ад 10 чалавек) — 9000. У кошт квітка на адборачны тур «Басовішча-2006» уваходзяць атракцыёны на ўсёй тэрыторыі парку.




КАІСА

# Відочная частка айсбэргу

Індыйскія мудрацы параўноўвалі шахматы з акіянам, у якім і камар нап'ецца, і слон выкупаецца. Мабыць, яны мелі рацыю. На «ўікэнд фізкультурніка» (20—21 траўня) у Менску ладзіліся зусім розныя шахматныя імпрэзы: чэмпіянаты Беларусі па хуткіх шахматах сярод хлопчыкаў і дзяўчат, першынство краіны ў рашэньні шахматных кампазыцыяў.

«Хуткія шахматы» — баржджэй забава, чым мастацтва ці навука. Вынікі, паказаныя ў спаборніцтвах са скарочаным кантролем (30 або 15 мінут на партыю), ня сьведчаць аб рэальнай моцы шахматыста. Усё ж назавём маладых гульцоў, якім найчасьцей пасьміхалася ўдача: Вольга Салаўёва з Воршы, Кірыла Ступак зь Менску.

У палажэньні аб турніры рашальнікаў гаварылася аб «папулярызацыі шахматнай кампазыцыі» згодна з рэглямэнтам ФІДЭ і пад кіраўніцтвам Беларускай фэдэрацыі шахмат. Аднак апошняя не падбала ня тое што пра рэкляму, а нават пра годнае памяшканьне для першынства краіны. Чатырнаццаць рашальнікаў, многія зь якіх прыбылі ў Менск за свой кошт, доўга парыліся ў цесных вучэбных клясах на Маркса, 10.

Пераможцам у каторы раз выявіўся 57-гадовы майстар спорту Валер Фрыгін — намдырэктара па вучэбнай рабоце 227-й магілёўскай вучэльні. Ён страціў балы на двух- і трохходоўках, затое даў рады этудам, шматхадоўкам, задачам на зваротны і каапэратыўны мат. Судзьдзя ўручыў яму кубак з надпісам… «чэмпіянат Беларусі па шахматах 2004 году». Леташні трыюмфатар Аляксандар Булаўка выглядаў стомленым. Дарма што заданьні здаліся яму лёгкімі, да фінішу прадпрымальнік з Клічава прыйшоў другім. «Бронза» — у гомельскага інжынэра Віктара Зайцава.

Прызэрамі конкурсу сталі вядомыя шахматныя кампазытары, што вытлумачальна: маючы досьвед складаньня задач і этюдаў, лягчэй разьвязваць чужыя. Аднак у Палацы шахмат мы назіралі відочную частку айсбэргу: рашальніцтва ня ёсьць чыста кампазытарскай справай. Сотні, а мо тысячы беларусаў бавяць час за шахматнай дошкай, шукаючы хараства... Шкада, што на тое пакуль не зважаюць ні ў фэдэрацыі шахмат, ні ў Мінспорту, ні ў Мінкультуры.

**ВР**

**Рашыце задачу**
Мат за 2 хады.



**Адказ:** 1. Ке5! (падманлівы сьлед — 1. Фd6 Фb5!). Паводле арбітра Уладзімера Сынова, адно з найскладанейшых конкурсных заданьняў. Сёлета на двуххадоўках пагарэлі такія «зубры», як браты Вадзім і Віталь Жылко, лідэр менскіх рашальнікаў Уладзімер Варташ.

## калі б...

**...ЗША працягвалі пашыраць сьпіс беларускіх чыноўнікаў, якія парушаюць правы чалавека.**




«Гаворыць капітан самалёта «Менск—Нью-Ёрк». Віншую з прыбыцьцём. Да пасадкі прашу заставацца ў крэслах, не паліць, не карыстацца мабільнымі тэлефонамі, а галоўнае — не парушаць правы чалавека!»



**...беларускія кадэбісты былі зусім вернымі дзяржынцамі.**

**...БРСМаўцы хацелі зрабіць сваю лятарэю папулярнай сярод моладзі.**




«А зараз галоўны прыз — права не ўступаць у БРСМ!»

МАЛЮНКІ І ТЭКСТЫ ЛЁЛІКА УШКІНА

## У НУМАРЫ


**Сяргей Ляшкевіч**



віны не прызнаў. Але можа выйсьці на волю ўжо зараз. **Старонка 4.**

**Атрымаць крэдыт і нічога ня страціць**



Банкам забаронена ўключаць у плату іншыя камісіі, акрамя працэнтавай стаўкі. **Старонка 23.**

**«Гудбай, бацька»**



Новы фільм «Навінак». **Старонка 25.**

**Хэ-хэ-хэ**



Вясёлая выстава Руслана Вашкевіча ў Музэі сучаснага мастацтва. **Старонка 26.**

**Пушкін incognitus**



Як расейскія літаратуразнаўцы ачышчалі Пушкіна ад замежных уплываў. **Старонка 19.**


## ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

**Вадзяніку Нямiскаму.** Вашай паэмы выдрукаваць ня хочам з розных прычынаў — як эстэтычнага, так і юрыдычнага характару. Каб яе прачытаў шырокі чытач, перадайце яе ў газэту «Свабода» («Тут і цяпер»).

**Раману Л. зь Менску.** Вершы нармальныя як тэксты для сьпеву. Праўда, момантамі кульгае беларуская мова. Культура мовы — важная штука, адна з асноваў эўрапейскае традыцыі. Таму з гэтым працуйце. Вам як юнаку, які выбірае сабе дарогу ў жыцьці, таксама варта памятаць, што не літаратурай адзінай жыве Беларусь і не літаратура прынясе нам вызваленьне.

**ЛК зь Менску.** «Праўду зь няпраўдай, / Цноту з гарэзіяй / Вымешай спрытам — / Будзе паэзія». Янка Купала.

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

**Што чуваць за граніцай?**

Змагаючыся з паўстаньнем у Альбаніі (турэцкай правінцыі), туркі сабралі багата войска ў тым куце свайго гасударства, каторы граічыць з найменшым у Эўропі Чарнагорскім каралеўствам. Чарнагорыя — гэта такі малы і слабы край, што ніхто на яе вялікай увагі не зьвяртаў бы і не аглядаўся, каб ня тое, што за ёй стаіць Расея, каторая ўсяляк паддзержывае чарнагорцоў і пільнуе іх незалежнасьці. Ведама, гэта пазваляе Расеі вясьці сваю палітыку на Балканскім палуострава, а чарнагорцам паддае сьмеласьці: яны вось цяпер сабралі вельмі многа свайго войска на граніцы з туркамі, заводзяць новыя стрэльбы і гарматы, — адным словам, як бы рыхтуюцца да вайны з Турцыяй.

…

У Кітаі ўсё болей і болей шырыцца жаданьне зьмяніць цяперашнюю імпэратарскую сям'ю, зрабіць моцны хаўрус зь японцамі і вызваліць Азію ад панаваньня эўрапейскіх гасударств...

**«Наша Ніва» 1911. №20**

## ЖАРТ

Адказам на заяву пра блякаваньне банкаўскіх рахункаў вышэйшых чыноўнікаў Беларусі ў банках Эўропы стаў указ Лукашэнкі пра блякаваньне рахункаў вышэйшых чыноўнікаў Эўропы ва ўсіх банках Беларусі.

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ВАНДРОЎКА

**Зьміцер Касьпяровіч** запрашае ў вандроўку 11 чэрвеня 2006 г. па маршруце: Косава — Ружаны — Лыскава — Пружаны — Шарашова — Лінова — Бяроза.
25 чэрвеня 2006 г.: Бальмонты — Слабодка — Друя — Браслаў — гара Маяк і Браслаўскія азёры — Дрысьвяты — Мяжаны — Опса — Відзы.
Т.: 292–54–58, 622–57–20, 509–12–16

### МУЗЫКА

**Шукаю** беларускамоўную хатнюю настаўніцу музыкі і сьпеваў для дзяўчынкі пяці з паловай гадоў. Т.: 216–87–50, 664–72–78. Анатоль

### НАБУДУ

Набуду налепку для клявіятуры зь беларускай раскладкаю. Пажадана чорную, але можна й белую. spadar_pett@tut.by

### КНІГІ

**Прадам** гадавыя падшыўкі «Нашай Нівы» з 1996 да 2001 г. і «Нашага слова» з 1998 да 2001 г. Т.: 336–67–36

### ПРАЕКТ

**Падрыхтаваны** эксклюзіўны энцыкляпэдычны даведнік «Рэпрэсаваныя сьвятары». Каля 2000 біяграфій расстраляных або загіблых у сталінскіх канцлягерах сьвяшчэнна- і царкоўнаслужыцеляў Беларусі. Калі вам вядома што пра пакутнікаў або ёсьць магчымасьць паўдзельнічаць у праекце, тэлефануйце: 753–82–12, 755–25–61, (017) 211–09–53. Леанід Маракоў


**Наша Ніва**
незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
галоўны рэдактар — Андрэй Дынько
фотарэдактар — Арцём Лява
нам.галоўнага рэдактара — Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
выдавец і заснавальнік — Фонд выданьня газэты «Наша Ніва»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**а/с 537, 220050, Менск**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**


© **НАША НІВА**.
Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 2571. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 31.05.2006.
Замова № 2969.
Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а